ПРАЛЕТАРЫ ВСЯГО СВЕТУ, САЕДНАЙЦЕСЯ!

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гарому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 88 (4340)
АЎТОРАК, 19 красавіка
1932 г.

МЕНСК, Савецкая 63

Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: Перадавы — За выкананьне прамфінпляну.
А. СТАЛЕВІЧ—У краіне белага тэрору ня дымяць фабрычныя трубы, расьце лес шыбеніц (2 стар.). М. ГАНЧАРЫК—Да 50-годзьдзя з дня сьмерці Ч. Дарвіна (3 стар.).
16-ты дзень масавай генэральнай праверкі падрыхтаванасьці да сяўбы (1 стар.).
Перавыбары саветаў у Койданаўскім польскім нацыянальным раёне (1 стар.).
Уводзіны да рэзалюцыі красавіцкай канфэрэнцыі (2 стар.). Даць краіне больш танных і высокаякасных харчовых прадуктаў (2 стар.).
ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА—За права рашаючага голасу на канфэрэнцыі ўдарнікаў якасьці (2 стар.).
ПАСТАНОВА ЦК УсеКП(б) ад 15 КРАСАВІКА — Аб самавольстве раду прашэўнікоў Растоўскага гарсавету (3 стар.). Работа паравоза залежыць ад машыніста (3 стар.).
Ператварыць Асоавіяхам у сапраўдны рэзэрв Чырвонай арміі (3 стар.).
Прадпрыемствы Магілева арганізуюць групы садзейнасьці РСІ (4 ст.).
Японія рыхтуецца да аднаўленьня ваенных дзеяньняў (4 стар.).
ПЛЯНЫ СТЫМСОНА (4 стар.).
Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі (4 стар.).

За выкананьне прамфінпляну

Выпікі першага кварталу, які нядаўна скончыўся, зьяўляюцца найбольш яркім і пераканаўчым паказальнікам буйнага разгортваньня вытворчых сіл сацыялістычнай гаспадаркі, паказальнікам вялікіх посьпехаў сацыялістычнай прамысловасьці. У першым квартале 1932 г. уся прамысловасьць НК цяжкай і лёгкай індустрыі дала прадукцыі на 32,1 проц. больш, чым у першым квартале мінулага году.

Цяжкая прамысловасьць БССР дабілася помпэтэнцыя валавой прадукцыі на 28,9 проц. у параўнаньні з адпаведным месяцам мінулага году. Ряд буйнейшых мэтальапрацоўчых заводаў «Пралетарыя», Гомсельмаш, «Комінтэрн», «Рухавік рэвалюцыі» закончылі перавыкананьні кварталыную праграму.

Вялікія посьпехі заваяваны лёгкай прамысловасьцю БССР, якая павялічыла выпрацоўку прадукцыі на 35,4 проц. у параўнаньні з адпаведным кварталам 1931 г. Перавыканалі квартальны праграмы фінпляну хлопчатая, гарбарная і шкляная вытворчасьці. Лёгкая прамысловасьць на справе ажыцьцяўляе ўдалае дырэктывы XVI зьезду і XVII канфэрэнцыі УсеКП(б) аб максымальным разгортваньні лёгкай індустрыі, у мэтах далейшага палепшэньня матэрыяльнага становішча працоўных мас Саюзу. Калі ў студзені было выпушчана прадукцыі на 23.505 тыс. руб., дык сакавік даў рост да 31.039 тыс. руб.

Дасягненьні ў рабоце прамысловасьці заваяваны дзякуючы рашучаму палепшэньню ўсёй работы ў сакавіку, мабілізацыі мас на барацьбу за прамфінпляны, на сьвяцкую арэтаваньня, рацыяналізацыі ў першыя два месяцы гэтага году.

Цяжкая прамысловасьць выканала праграму за сакавік на 104,4 проц., лёгкая на 102,5 проц. Гэта вынік пасьпяховай рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна на рацыі прадпрыемстваў, пэўных арэтаў у перабудове кіраўніцтва на-новаму, вынік наблюдзеньня партыйнай і прафэсыянальнай работы на ніязвога вытворчага вызьма. Станоўчую ролю ў палепшэньні работы прадпрыемстваў адыграла ацэнкаваньне становішча на першай Беларусі ДРЭС, перабоі ў рабоце якой у 4-м квартале мінулага году і ў студзені г. г. прыносілі мільённыя страты прамысловасьці. Вялікарнае значэньне мела палепшэньне снабжэньня раду заводаў сырцом.

Аднак тэмпы ажыцьцяўленьня заданьняў у сакавіку не ўстрымліся на такую вышыню, каб забясьпечыць поўнае выкананьне квартальнай праграмы і ліквідацыю вялікай запазычанасьці першых двух месяцаў. Агідна дрэнна працавала паперовая прамысловасьць, якая выканала квартальную праграму на 56,2 проц. Выпікі ня работы самым адмоўным чынам адбіліся на агульных паказальніках: квартальны прамфінплян прамысловасьці б. ВСНГБ выкананы толькі на 86,9 проц. Краіна не атрымала прадукцыі звыш чым на 14 млн. руб.

Вынучэньне прычын зрыву прамфінпляну паперовых фабрык БССР паказвае, што толькі поўная адсутнасьць перабудовы работы як гаспадарчых, так і грамадзкіх арганізацый прывяла да сапраўды ганебных паказальнікаў.

Апартуністычная стаўка на самацёк, «лявацкая» ўраўнілаўка, абязьлічка, ігнараваньне матар'яльна-бытавых запатрабаваньняў рабочых, пропная работа каапэрацыі, нездаваньняючая арганізацыя працы, слабасьць тэхнічнага нармаваньня, слабасьць партыйна-масавай работы, зусім невыстарчальнае ўкараненьне гаспадарчага разрахунку, недаацэнка ролі гаспадарча-разрахунковых брыгад, як вынтэйшай формы сацыялістычнага арганізаваньня — вось прычыны адставаньня.

Бліскучы прыклад тых невычарпальных патэнцыяльных магчымасьцяй, якія закладзены ў правільным узначаленьні вытворчага ўзьдыму рабочых мас, у выразным ажыцьцяўленьні 6 умоў тав. Сталіна, дае вопыт буйнейшага заводу с.-г. машын — Гомсельмашу. Гэты завод выйшаў на першае месца сярод прадпрыемстваў мэтаапрацоўчай прамысловасьці, выканаўшы 119,3 проц. квартальнага заданьня. Ён зусіх новую вытворчасьць — выраб канцэрна - сартовак, удасканаліў сыстэму сілазарэзак, перанёсшы вае заданьні па асноўных асартыментах мацны.

XVII усесаюзная партканфэрэнцыя і XIV зьезд КП(б)Б высунулі **якасьць работы, якасныя паказальнікі**, як цэнтральную баявую задачу чацьвертага **заключнага году**. Пытаньню выкананьня якасных паказальнікаў дагэтуль не аддавалася той увагі, якой яно заслугоўвае. Аб гэтым выразна гаворыць той факт, што мы дагэтуль ня маем выпікаў ажыцьцяўленьня якасных паказальнікаў за першы квартал, ёсьць выпікі толькі за першыя два месяцы. Яны зусім незадавальняючыя. Студзень даў палепшэньне сабекошту на 2,1 проц., лоты — на 3,2 проц. Заводы асноўнай хэміі павысілі сабекошт у лютым сімаль на 15 проц., запалкавыя фабрыкі — амаль на 19 проц. На 6,8 проц. перавыканана заданьне па паляпшэньні прадукцыйнасьці працы (у адносінах да сярэдняга гадавога пляну), у той час, як памер сярэдняй мог сацыялістычнай прамысловасьці.

зарплаты адзнаго рабочага складае 103,6 проц. Гэта адставаньне можна тлумачыць толькі слабай рэалізацыяй некаторымі прадпрыемствамі 6 умоў тав. Сталіна, нездавальняючай мабілізацыяй унутраных рэсурсаў, слабым разгортваньнем рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, зусім невыстарчальнай рэалізацыяй дырэктыў партыі аб ўкараненьні і ўмацаваньні гаспадарчага разрахунку, аб уцягваньні ўнутры-прамысловых накапленьняў, перэшце, скажэньнямі і памылкамі ў перабудове сыстэмы зарплаты і тэхнічнага нармаваньня.

Вопыт прадпрыемстваў гарбарнай прамысловасьці, якая зьнізіла сабекошт у студзені на 5,6 проц., гаворыць аб тым, што толькі ў барацьбе за ўнутры - заводзкія накапленьні, за максымальнае скарыстаньне рэсурсаў, за разгортваньне творчай ініцыятывы мас закладзен ключ да перамог на шляху якасьці.

У другім квартале г. г. перад прамысловасьцю БССР, перад усёй пралетарскай грамадзкасьцю стаіць задача замацаваць той узьдым, той арух, якога дасягнулі многія прадпрыемствы БССР у сакавіку. Шляхі для гэтага паказаны і праверены ўсім ходам работы прадпрыемстваў. Гэта — гібкае, апэрацыйнае, жывое кіраўніцтва, умелае ўзначаленьне вытворчага энтузіязму мас, далейшае пяўтлівае ўкараненьне 6 умоў тав. Сталіна ў прамысловасьці, умацаненьне сапраўднага адзінаначальля, перабудова партработы, узмацненьне ролі майстра і брыгадзіра, як «непасрэдных арганізатараў працоўных працэсаў» (з рэзалюцыі XVII партканфэрэнцыі), умелая пастаноўка **партыйна-масавай работы** і жорсткі кантроль рублём над якасьцю работы.

Да трэцяй гадавіны сацыялістычнага спаборніцтва рабочых масквоўскага аўтазаводу імя Сталіна зьвярнуліся да ўсіх рабочых БССР з заклікам замацаваць і яшчэ далей разьвіваць посьпехі сацыялістычнага спаборніцтва, выйсьці на першамайскую дэманстрацыю з рапартамі аб перавыкананьні прамфінпляну. На заклік сталінцаў рабочыя масы БССР адкажуць яшчэ большым уздымам сацыспаборніцтва і ўдарніцтва, новай хваляй творчага энтузіязму, накіраванага на выкананьне нашых плянаў, на завяваньне тэхнічна - эканамічнай незалежнасьці Саюзу. Ініцыятыва чырвонамаскоўскага заводу «Бальшавік», які выступіў з адказам сталінцам і ўзяў на сябе рад канкрэтных гамагабяспэчальнасьцяў, павінна быць падхоплена ўсімі прадпрыемствамі. У гэтым — запорука новых буйных перамог сацыялістычнай прамысловасьці.

Перавыбары саветаў у Койданаўскім польскім нацыянальным раёне праходзяць пад знакам вялікай актыўнасьці мас калгасьнікаў і аднаасобнікаў

КОЙДАНАВА. (Па тэлефону). Па раёне шырока разгарнулася справаздачна-перавыбарчая кампанія сельсаветаў. Калгасьнікі і аднаасобнікі з вялікай энтузіязмам сустрэлі пастанову ўраду БССР аб перавыборах раёну ў нацыянальна-польскі. Гэта сьцьвярджаецца тэй вялізарнай актыўнасьцю і высокім процантам удзельнікаў, якія прымаюць удзел у перавыборах сельсаветаў.

Першыя даныя па 14 сельсаветах паказваюць, што процант удзельнікаў у перавыбарчай кампаніі значна вышэй, чым у мінулыя гады. У сярэднім на гэтых сельсаветах прынялі ўдзел у перавыборах 78 проц. выбаршчыкаў. Лепшыя ўзоры падрыхтаванасьці паказалі Паланевіцкі, Навасёлкаўскі і Станькаўскі сельсаветы. У сярэднім па гэтых сельсаветах прымала ўдзел 88-93 проц. выбаршчыкаў. У Паланевіцкім сельсавеце кіраўнікі школ сіламі вучняў арганізавалі догляд малых дзяцей і ахову маемасьці ў дамах з тым, каб даць магчымасьць усім дарослым прымаць удзел у выбарах.

Асабліва актыўны ўдзел прымаюць у перавыбарах жанчыны. Па 14 сельсаветах сярэдні ўдзел жанчын складае 69 проц., а па Азерскім, Паланевіцкім і Станькаўскім сельсаветах сярэдні ўдзел жанчын у перавыбарах складае 85 проц.

Калгасы Ляхавіцкага і Пугачынскага сельсаветаў падрыхтоўку да перавыбараў адзначалі ўзмацненьнем мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў на збораны, калгасьнікі высунулі сустрэчны плян па сілазасыпцы на 10 тон. Пастаноўлена таксама ўбраць усю атаву сенажацяў і капюшоны, што павялічыць кармовую базу калгасу.

Зараз ўжо вызначаны вучасткі для пашы ўсёй жывёлы як аграмаджанага стада, так і калгасьнікаў.

Для дапамогі калгасьнікам кармамі, праўленьне калгасу выдзеліла 30 пуд. сена і 60 пуд. амэшцяў. Калгас кармамі забясьпечан на ўвесь час палявых работ.

Чыкун.

Першы надзвычайны зьезд саветаў Койданаўскага нацыянальна-польскага раёну адбудзецца 27 красавіка 1932 году ў Койданаве

Дапамогай калгасьнікам у набыцьці жывёлы,

пашырэньнем пасеваў кармовых культур адказваюць калгасы БССР на пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б

КАЛГАС „БУДАЎНІК" ДАПАМАГАЕ КАЛГАСЬНІКАМ НАБЫЦЬ ЖЫВЁЛУ

ВУЗДА. (Ад наш. спэц. кар.). Калгасьнікі арцелі **«Будаўнік»**, Камянецкага сельсавету, на сваім сходзе абмеркавалі пастанову ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б «аб прымусовым абагуленьні жывёлы». Калгасная маса сустрэла пастанову з вялікім энтузіязмам. Сход вызначыў канкрэтныя мерапрыемствы па рэалізацыі гэтай дырэктывы партыі.

У калгасьніка **Рамашэўскага** загінула карова, але ў яго застаецца добрая двухгадовая цялушка, прыгодная якая знаходзіцца ў асабістым карыстаньні, калгасьнікі выступілі сустрэчным планам на племя. Сход ухваліў абмяняць Рамашэўскаму цялушку на карову з аграмаджанага стада.

У калгасьніцы **Лінэвіч** ёсьць карова, але прыгодная толькі на мясо. Праўленьне калгасу абавязалася дапамагчы Лінэвіч выміняць на загатоўчым пункце Белмяса яе карову на малочную.

Для пашырэньня кармовай базы і забясьпячэньня кармамі ня толькі аграмаджанага стада, але і жывёлы, якая знаходзіцца ў асабістым карыстаньні, калгасьнікі выступілі сустрэчным планам на 10 проц. Пастаноўлена таксама ўбраць усю атаву сенажацяў і капюшоны, што павялічыць кармовую базу калгасу.

Зараз ужо вызначаны вучасткі для пашы ўсёй жывёлы як аграмаджанага стада, так і калгасьнікаў.

Для дапамогі калгасьнікам кармамі, праўленьне калгасу выдзеліла 30 пуд. сена і 60 пуд. амэшцяў. Калгас кармамі забясьпечан на ўвесь час палявых работ.

Чыкун.

Абвяржэньне ТАСС

МАСКВА, 18. (Па тэлефону). Замежная прэса працягвае распаўсюджваць правакацыйныя чуткі аб сувязі генэрала Ма з СССР і, у прыватнасьці, аб яго знаходжаньні ў Благавешчанску. Агенцтва Рэйтар і газэта «Нью-Ёрк Таймс» працягваюць сьцьвярджаць аб знаходжаньні генэрала Ма на тэрыторыі СССР на тэй падставе, што старшыня камісіі Лігі нацый у Кітаі атрымаў тэлеграму ад імя генэрала Ма з Благавешчанску.

Наколькі нам вядома, тэлеграма памечана ня толькі Благавешчанскам, але і Сахалянам, як месцам адпраўкі. З усяго відаць, што генэрал Ма адпраўляў яе з Сахаляну праз кітайскае консульства ў Благавешчанску. Тым ня менш, замежная прэса працягвае на гэтым будаваць сваю необгрунтаваную кампанію.

Як відаць з учарайшага паведамленьня ТАСС, сапраўды кітайскі консул у Благавешчанску злоўжываў прадастаўленым яму правам шыфраванай перапіскі, адпраўляў пад відам сваіх тэлеграм адозвы і паведамленьні генэрала Ма. Як толькі гэты факт стаў вядомы Народнаму Камісарыяту Замежных Спраў, кітайскі консул у Благавешчанску быў пазбаўлен права перадачы шыфраваных тэлеграм за злоўжываньне гэтым правам і манчжурскім уладам было заяўлена аб неадкладным адкліканьні кітайскага консула ў Благавешчанску.

Што-ж датычыць хлусьлівых паведамленьняў аб знаходжаньні генэрала Ма ў Благавешчанску, то ТАСС яшчэ раз заяўляе, што генэрал Ма ня быў і яго няма ні ў Благавешчанску, ні ў якім-небудзь іншым пункце СССР.

16-ты дзень масавай генэральнай праверкі падрыхтаванасьці да сяўбы

ЛІСТ ЦК ЛКСМБ—БАЯВАЯ ПУЦЁЎКА РАБОТЫ КОЖНАГА КАМСАМОЛЬЦА

Ленінскі камсамол, пад кіраўніцтвам партыі, павінен паказаць лепшыя ўзоры барацьбы за трэцюю бальшавіцкую вясну

НА ШТУРМ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

Галоўнай задачай веснавой сяўбы зьяўляецца барацьба за якасьць сельска-гаспадарчай вытворчасьці, павышэньне ўраджайнасьці на асноўе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Камсамол БССР ва ўсёй гэтай рабоце павінен адыграць выключную ролю. Ліст ЦК ЛКСМБ, які мы сёньня зьмяшчаем, вызначае рад канкрэтных задач і зьяўляецца баявой пуцёўкай для камсамольскіх арганізацый і ўсіх камсамольцаў у падрыхтоўцы і правядзеньні бальшавіцкай сяўбы.

Пад аб арганізацыі масавага выхаду ў поле павінна быць падхоплена ўсімі камсамольскімі арганізацыямі і камсамольцамі, усёй працоўнай моладзьдзю. Павышаючы сваю клясавую баяздольнасьць, кожны член ЛКСМБ павінен стаць сапраўдным арганізатарам веснавой сяўбы і сельска-гаспадарчай вытворчасьці, быць лепшым ударнікам сацыялістычных палёў і памочнікам партыі па арганізацыі сяўбы ў аднаасобным сэктары, змагацца за поўнае выкананьне і перавыкананьне сельска-гаспадарчага пляну чацьвертага, заключнага году пяцігодкі.

Ліст ЦК ЛКСМБ павінен стаць здабыткам шырокіх мас калгаснай бядняцка-серадняцкай і рабочай моладзі, павінен стаць неадлучнай часткай масава-палітычнай кампаніі, якая зараз праводзіцца па абмене камсамольскіх білетаў.

Задача ўсіх раённых партыйных арганізацый—узмацніць кіраўніцтва камсамольскімі арганізацыямі, дапамагчы ім у ажыцьцяўленьні задач, пастаўленых партыяй.

Пуцёўка выдана. Шырокімі калёнамі ўвесь ленінскі камсамол павінен, вядучы за сабой шырокія працоўныя масы моладзі, выступіць на штурм трэцяй бальшавіцкай вясны.

Усім арганізацыям, усім членам ЛКСМБ

Пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, камсамольская арганізацыя Беларусі разгортвае бальшавіцкую работу па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Аднак, тэмпы работы да гэтага часу пакуль усё яшчэ невыстарчальныя.

У працэсе падрыхтоўкі да сяўбы высунутыя паасобнымі арганізацыямі станоўчыя узоры работы («мітынг трактараў» — Жыткавічы, **«зямля загаварыла»**, арганізацыя брыгад «Діп»—Дрыса) яшчэ ня сталі здабыткам усёй арганізацыі.

Рэспубліка папярэдадні разгортваньня сяўбы.

ЛЕНІНСКІ КАМСАМОЛ, ЯКІ ДАКАЗАЎ НА ЎСІМ ПРАЦЯГУ СВАЙГО ІСНАВАНЬНЯ І ДЗЕЙНАСЬЦІ САПРАЎДНУЮ АДДАНАСЬЦЬ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ, ПАВІНЕН З ГОНАРАМ ВЫЙСЬЦІ ПЕРАМОЖЦАМ НА ФРОНЦЕ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ.

На аснове баявога выкананьня пастаноў пленуму ЦК КП(б)Б, пад кіраўніцтвам мясцовых партарганізацый, арганізуючы масы камсамольцаў і моладзі на далейшую рашучую барацьбу з клясавым ворагам, кожная камсамольская ячэйка, **кожны камсамолец павінен зьявіцца рашаючай сілай у падрыхтоўцы і правядзеньні бальшавіцкай сяўбы ў калгасах, саўгасах, МТС і аднаасобным сэктары.**

ЦК ЛКСМБ заклікае ўсе камсамольскія арганізацыі Беларусі, усіх камсамольцаў неадкладна ўключыцца і забясьпечыць поўную рэалізацыю пастаноў партыі і Саюзу па сяўбе.

Устаноўка сакратара ЦК КП(б)Б тав. **Гікало** аб тым, што **«камсамол Беларусі павінен быць ініцыятарам і арганізатарам масавага выхаду ў поле на сяўбу, бо гэта ў асноўным вырашае пасьпяховае правядзеньне бальшавіцкай сяўбы»**, зьяўляецца пуцёўкай партыі лепшаму камсамолу Беларусі ў правядзеньні гэтай надзвычай важнай палітычнай кампаніі.

Кожны калгасьнік, кожны рабочы і камсамолец павінен з гонарам апраўдаць балвы наказ партыі.

Павінен быць зараз-жа камандыраваны ўвесь раённы камсамольскі актыў у ячэйкі. Сіламі камсамолу праверана гатоўнасьць трактараў і сельска-гаспадарчага інвэнтару да веснавой сяўбы, арганізаваны паказальны пробны масавы выезд у поле. Камсамольцы паінны быць расстаўлены на рашаючых вучастках. Кожны камсамолец павінен мець і выканаць канкрэтнае заданьне па падрыхтоўцы і правядзеньні масавага выхаду ў поле—на сяўбу. Выходячы з умоў кожнага раёну, павінен быць вызначан **агульны раённы дзень масоўкі.**

ДЗЕНЬ МАСАВАГА ВЫХАДУ Ў ПОЛЕ ДЛЯ ВОРЫВА ПАВІНЕН ПЕРАТВАРЫЦЦА Ў НОВЫ ЎЗДЫМ КАЛГАСНАГА РУХУ НА АСНОВЕ ЯШЧЭ БОЛЬШАГА ГАСПАДАРЧА-АРГАНІЗАЦЫЙНАГА ЎМАЦАВАНЬНЯ КАЛГАСАЎ І Ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ ІХ РАШАЮЧАГА ЗЬВЯНА — БРЫГАДЫ.

Камсамольцы павінны стаць ініцыятарамі ўзяцьця брыгадай раду канкрэтных самаабавязацельстваў па такіх паказальніках, як палепшэньне якасьці сяўбы, высоўваньне сустрэчных тэрмінаў сяўбы у бок іх зьмяншэньня, эканомія трактарыстамі гаручага беражлівыя адносіны да сельска-гаспадарчага інвэнтару, належны догляд за рабочай жывёлай, захаваньне агратэхнічных правіл.

Вакол дня масавага ворыва троба загадзя разгарнуць масава-агітацыйную, работу падрыхтаваўшы да дня выхаду ў поле ўсе формы агітацыйна-мастацкага абслугоўваньня (радыё, насьценнагазэта, хата-чытальня, драматычныя гурткі), пабудаваўшы іх работу па мясцовым матар'яле, перанёсшы іх дзейнасьць на месцы палявых работ, шырока прыцягваючы да гэтай работы ўсіх незанятых непасрэдна на полі камсамольцаў, моладзь і асабліва піянэраў і школьнікаў.

Райкомы, калектывы і ячэйкі ЛКСМБ павінны **арганізаваць сацыялістычнае спаборніцтва паміж брыгадамі ўнутры калгасу, калгасамі**—унутры сельсавету, сельсаветамі —унутры раёну на лепшую арганізацыю дня масавага ворыва. ЦК асабліва падкрэсьлівае неабходнасьць большай аддачы ўвагі падрыхтоўцы да выхаду ў поле аднаасобнага сэктару. Усякім апартуністычным спробам ігнараваньня аднаасобнага сэктару павінен быць нанесен зьнішчальны ўдар.

ЦК абавязвае ўсе ячэйкі, калектывы і раённыя камітэты ЛКСМБ падрыхтаваньня з рапартамі аб ступені падрыхтаванасьці да сяўбы, да выступленьня ва ўсебеларускай камсамольскай радыё-пераклічцы, намечанай да правядзеньня ў канцы красавіка.

ЦК прапануе **«Чырвонай Зьмене» і «Юнгер Арбайтэр»** правесьці завочную нараду-кансультацыю сакратароў РК і калгасных ячэек ЛКСМБ па пытаньнях форм і мэтадаў падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

Зьвярнуцца ў ЦК КП(б)Б і ЦВК БССР з просьбай аб устанаўленьні чырвонага сьцягу ЦК і ЦВК і премії лепшаму раёну, сельсавету, калгасу, брыгадзе, ударніку за падрыхтоўку да веснавой сяўбы.

ЦК абавязвае ўсе камсамольскія арганізацыі папярэдняя правесьці шырокую тлумачальную работу ў арганізацыі, сярод калгасьнікаў і рабочых саўгасаў.

ЦК БУДЗЕ ЛІЧЫЦЬ ЛЕПШЫМ УЗОРАМ ВЫКАНАНЬНЯ ЎЗЯТЫХ КАМСАМОЛЬЦАМ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ У СУВЯЗІ З АБМЕНАМ СВАЙГО БІЛЕТУ ПА ТЫМ, НАКОЛЬКІ ІМ БУДЗЕ ПРАВЕДЗЕНА ПАДРЫХТОЎКА І НАКОЛЬКІ КАМСАМОЛЕЦ АРГАНІЗУЕ МАСЫ НА СВАЯЧАСОВЫ ВЫХАД НА СЯЎБУ І НА ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНАЎ.

ДА 7-Й УСЕСАЮЗНАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ УсеЛКСМ КАМСАМОЛ БЕЛАРУСІ РАПАРТУЕ ПАРТЫІ І ЦК УсеЛКСМ АБ ВЫКАНАНЬНІ І ПЕРАВЫКАНАНЬНІ Ў ТЭРМІН ПЛЯНУ СЯЎБЫ.

Райкомы ЛКСМБ павінны прадставіць у ЦК вычарпальныя даныя аб праробленай камсамолам работе ў гэтым напрамку і аб выніках масавага выхаду ў поле.

ЦК ЛКСМБ зьвяртаецца да ўсіх арганізацый, да ўсіх рабочых і калгасьнікаў зараз-жа абмеркаваць і ўключыцца ў сваячасовы і масавы выхад на сяўбу, які праводзіцца камсамолам.

БЕЛАРУСЬ ПАВІННА ВЫКАНАЦЬ І ПЕРАВЫКАНАЦЬ ПЛЯН СЯЎБЫ.

Ленінскі камсамол—верны памочнік партыі, абавязуецца паказаць сапраўды бальшавіцкія ўзоры на фронце барацьбы за бальшавіцкую сяўбу.

Сакратар ЦК ЛКСМБ — ГЕРЦОВІЧ.

Апошнія весткі з пасеўнага фронту

КОЙДАНАВА. (Па тэлефону). У радзе калгасаў раёну распачаліся палявыя работы. **Першымі выйшлі ў поле калгасы Ляхавіцкага і Бароўскага сельсаветаў.**

Калгас **«Трыбуна Радзецка»**, Паланевіцкага сельсавету, ужо засеяў першыя гектары яравых. Таксама разгарнуліся масавыя палявыя работы ў калгасах **імя Крупскай, «Ударнік», «Орка», імя Калініна** і інш.

***

НАРОЎЛЯ. (Па тэлеграфу). Калгасы прыступілі да сяўбы. Узарана 200 гектараў. Калгас «Камінтэрн», «Новы Канатоп» засеялі 15 га аўса.

Райкалгасаюз тармозіць сяўбу—насеньне, якое ёсьць у яго распараджэньні, не разьмеркавана.

Райпартком накіраваў 50 таварышоў у сельсаветы на дапамогу ніязвым арганізацыям.

Віленскі.

СТАРОБІН. (Па тэлеграфу). У Старобіне распачалася сяўба. У першы дзень засеяна 6 га шпалішы, 53 капюшоны. Узышла пад лубін 47 га.

Холад.

***

КАСЬЦЮКОВІЧЫ. (Па тэлеграфу). Раён прыступіў да сяўбы яравых. Калгасы «Чырвоная пашня» і «Іскра» засеялі 6 га ячменю.

Райза.

***

НЕГАРЭЛАЕ. (Наш кар.). Саўгас **«Негарэлае»** цалкам падрыхтаваўся да сяўбы. Увесь інвэнтар адрамантаваны, насеньне сабрана. Рабочая сіла разьбіта на брыгады. Прамфінплян даведзен да брыгады і да рабочага.

У выніку прапрацоўкі пляну рабочыя высунулі сустрэчны, павялічыўшы пасеўную плошчу на 50 га.

16 красавіка пачаліся палявыя работы. Ідзе сяўба.

Масавая самаправерка забясьпечыла падрыхтаванасьць да сяўбы

ЖЫТКАВІЧЫ. Калгасы Руднянскага, Жыткавіцкага і Бялеўскага сельсаветаў па-баявому правялі самаправерку гатоўнасьці да выхаду ў поле. У кожным калгасе былі арганізаваны праверачныя брыгады з калгасьнікаў-ударнікаў і накіраваны ў другія калгасы гэтых сельсаветаў для праверкі і абмену вопытам работы.

Асабліва актыўна працавалі брыгады ў калгасах «Паляна», «Трэці Інтэрнацыянал» і ў камуне «Ленінская Беларусь». Пасьля работы брыгады на агульным сходзе падагулілі вынікі праверкі. Праверка паказала, што калгасы да сяўбы гатовы. Насеньне і страхавыя поўнасьцю ссыпаны і ачышчаны, інвэнтар адрамантаван. Рабочая сіла калгасаў разьбіта на вытворчыя брыгады, за якімі замацаваны вучасткі зямлі, інвэнтар, цягавая сіла і г. д.

На агульных сходах і брыгадах распрацаваны і зацьверджаны нормы выпрацоўкі.

Шляхам рэалізацыі аблігацый насеннай пазыкі камуна «Ленінская Беларусь» стварыла фонд міжкалгаснай насеннай узаемадапамогі ў 100 кгр. ячменю, 100 кгр. пшаніцы і больш 100 кгр. насеньня ільну.

Сваю падрыхтаванасьць калгасы праверылі пробным выездам у поле, які быў наладжан 8 красавіка. Калгасьнікі ўсе як адзін брыгадамі прымалі ўдзел у выезьдзе.

Калгасьнікі з напружанасьцю, у баявой гатоўнасьці чакаюць першага дня выезду ў поле.

Гэта ўсё рабілася і робіцца ў калгасах. Масавая праверка, аднак, не закрапула аднаасобнага сэктару. Жыткавіцкага раёну. Гэта зьяўляецца, буйнай памылкай. Недаацэнка аднаасобнага сэктару, ігнараваньне яго грае на руку клясаваму ворагу. Гэта памылка павінна быць неадкладна выпраўлена.

М. Верабей.

Больш увагі кантрактацыі яравых

ТОЛЬКІ 35 РАЁНАЎ СПУСЬЦІЛІ ПЛЯНЫ ДА СЕЛЬСАВЕТАЎ

Галоўнейшай задачай веснавой с.-г. кампаніі зьяўляецца барацьба за поўнае выкананьне пляну веснавой сяўбы за далейшае павышэньне ўраджайнасьці, за ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі аб арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў, за якасныя паказальнікі ў сацыялістычным земляробстве.

Кантрактацыя яравых пасеваў 1932 году — адзін з важнейшых вагароў у ажыцьцяўленьні пастаўленых задач.

Сёлета па БССР плян кантрактацыі яравых пасеваў складае 505.000 га. Пасьпяховае выкананьне гэтага пляну кантрактацыі патрабуе належнай увагі з боку ўсіх партыйных, савецкіх і ў першую чаргу загатоўчых і калгасных арганізацый.

Аднак, да гэтага часу ні адзін з раёнаў не разгарнуў, як належыць, работу па кантрактацыі. На 10 красавіка плян кантрактацыі выкананы толькі на 7,5 проц. і даведзен да калгасаў і сельсаветаў толькі да 35 раёнах. Магілеўскі РВК зусім адмаўляецца ад мабілізацыі работнікаў на правядзеньне кантрактацыі, матывуючы тым, што гэта справа «райзагатзярно».

Бязьдзейнасьці і апартуністычным разважаньням неабходна абвясьціць самую рашучую барацьбу.

Неабходна зараз-жа на аснове масавай работы растлумачыць усім калгасьнікам і аднаасобнікам — беднякам і серадняком значэньне кантрактацыі, як пляннавага заказу дзяржавы сельскай гаспадарцы, заказу, які зьяўляецца сустаўной часткай пляну пабудаваньня сацыялізму ў нашай краіне. Для гэтага на правядзеньне кантрактацыі неабходна мабілізаваць увагу ўсёй грамадзкасьці і ў першую чаргу партыйных, камсамольскіх, савецкіх і прафсаюзных арганізацый.

Асабліва сур'ёзная адказнасьць за пасьпяховы ход кантрактацыі ўскладаецца на сельсаветы, якія непасрэдна ажыцьцяўляюць дырэктывы партыі і ўраду на вёсцы.

Разам з тым троба не дапусьціць паўтарэньня леташніх памылак, калі кагавары па кантрактацыі ў радзе раёнаў заключаліся без папярэдняга шырокага абмеркаваньня іх на агульных сходах калгасьнікаў і аднаасобнікаў. У выніку такой практыкі шмат якія кантрактанты наваг ня вецаю, якія плошчы і пад якія культуры яны кантрактуюць.

Супроць гэтых скажэньняў, супроць апартуністычнай недаацэнкі масавай работы пры кантрактацыі падмены яе адміністраваньнем, неабходна навесьці бязьлітасную барацьбу.

Толькі сваячасовае правядзеньне кантрактацыі, на аснове шырокай масавай работы зьвяцца магутным вагаром у барацьбе за выкананьне пасеўных пляна ў трэцій бальшавіцкай вясны.

Сайкоў.

Да адказнасьці зрыўшчыкаў кантрактацыі

ВОРПІА.—Пляны кантрактацыі яравых пасеваў паінны былі быць даведзены сельсаветам не пазьней 20 сакавіка.

Райснаб толькі 16 сакавіка склікаў нараду з прадстаўнікоў МТС, Плодагародніны, райкалгасаюзаў, райзем-чэстаў і іншых зямельна - калгасных і загатоўчых арганізацый для выбару камісіі па складаньні пляна кантрактацыі. Райснаб абавязаў камісію складзьці плян да 19 сакавіка (да 20 сакавіка паінны іх атрымаць сельсаветы).

Але і на ёпецці дзень да складаньня пляна кантрактацыі яравых камісія не прыступіла.

Гэты факт гаворыць аб яўным ігнараваньні важнейшай гаспадарча - палітычнай кампаніі з боку зямельна-калгасных і загатоўчых арганізацый Адпаначыны.

Райком партыі паінен пераканаўча ўжыць рашучыя заходы да тых, хто тармозіць і зрывае кантрактацыю.

Б.

УВОДЗІНЫ ДА РЭЗАЛЮЦЫЙ КРАСАВІЦКАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ

Красавіцкая канфэрэнцыя, работы якой працякае пад непасрэдным кіраўніцтвам Леніна, адыграла вялізарную ролю ў гісторыі нашай партыі і ў разьвіцьці рэвалюцыі 1917 году. Рэзалюцыі канфэрэнцыі, якія маюць у сябе дакладна прадуманую і шырока распрацаваную праграму барацьбы рабочай клясы за пралетарскую дыктатуру, за сацыялізм, зьяўляюцца важнейшымі дакумэнтамі бальшавізму ў перыяд паміж лютым і кастрычнікам 1917 году. Амаль усе рэзалюцыі напісаны ў аснове Леніным.

Надаючы вялізарнае значэньне пастановам красавіцкай канфэрэнцыі, Ленін асабіста, як гэта відаць з матар'ялаў, што захаваліся, падрыхтаваў рэзалюцыі да друку, указаўшы парадак іх разьмяшчэньня, лік галасоў, паданых за тую ці іншую рэзалюцыю і інш. Надрукаваным у асобным дадатку да № 13 «Солдатской правды» ад 3(16) мая 1917 г. рэзалюцыям прадпаслана адозва да рабочых, у якой дана кароткая характарыстыка становішча, якое перажывалася краінай, асьветлены роля і значэньне прынятых партыяй пастаноў і ўказаны задачы, што стаяць перад рабочай клясай. Гэта адозва, бадай, напісана таксама Леніным, хоць рукапіс яе не захаваўся. Адозва ня мае загалоўку. Намі яна друкуецца як «Уводзіны да рэзалюцый красавіцкай канфэрэнцыі».

ІНСТЫТУТ МАРКСА — ЭНГЕЛЬСА — ЛЕНІНА ПРЫ ЦК УсеКП(б).

Таварышы рабочыя!

Усерасійская канфэрэнцыя Расійскай Сацыял-Дэмакратычнай Рабочай Партыі, аб'яднаная Цэнтральным Камітэтам і якая ў прастарэччы называлася партыяй «бальшавікоў», скончылася.

Канфэрэнцыя прыняла вельмі важныя пастановы па ўсіх карэнных пытаньнях рэвалюцыі, і мы друкуем ніжэй поўны тэкст гэтых пастаноў.

Рэвалюцыя перажывае крызіс. Гэта відаць было на вуліцах Петраграду і Масквы 19-21 красавіка. Гэта прызнана Часовым Урадам. Гэта прызнана Выканаўчым камітэтам Петраградзкага Савету Рабочых і Салдацкіх Дэпутатаў. Гэта пацьверджана зноў і зноў раз у той момант, калі мы пішам гэтыя радкі, адстаўкай Гучкова.

Крызіс улады, крызіс рэвалюцыі — не выпадковасьць. Часовы Урад ёсьць урад памешчыкаў і капіталістаў, зьвязаных рускім і англа-французкім капіталам і вымушаных працягваць імпэрыялістычную вайну. Але салдаты злучаны вайной, яны ўсё яснейей усьведамляюць, што вайна вядзецца з-за інтарэсаў капіталістаў, яны ня хочуць вайны. І, разам з тым, на Расію, як і па іншыя краіны, насоўваецца гразная здань жахлівага краху, бясхлеб'я, поўнай гаспадарчай разрухі.

Петраградзкі Савет Рабочых і Салдацкіх Дэпутатаў, які заключыў згоду з Часовым Урадам і падтрымліваў яго, падтрымліваў пазыку, а значыцца, і вайну, сайшоў таксама ў тупік. Савет нясе адказнасьць за Часовы Урад і, бачачы безвыходнасьць становішча, ён таксама заблытаўся гэтай сваёй згодай з урадам капіталістаў.

У гэты вялікі гістарычны момант, калі ўсё будучае рэвалюцыі пастаўлена на карту, калі капіталісты мітусяцца паміж роспачаю і мыслью аб расстрэле рабочых, наша партыя выступае перад народам і ў пастановах сваёй канфэрэнцыі гаворыць яму:

Трэба зразумець, якія клясы рухаюць рэвалюцыю. Трэба цьвяроза ўлічыць іх розныя імкненьні. Капіталіст ня можа ісьці тым-жа шляхам, што работы. Дробныя гаспадарыкі ня могуць ні поўнасьцю даверыцца капіталістам, ні адразу і ўсе адважыцца на бацькі — цесны саюз з рабочымі. Толькі зразумеўшы розьніцу гэтых клясаў, можна знайсьці верны шлях для рэвалюцыі.

І пастановы нашай канфэрэнцыі, на ўсіх карэнных пытаньнях народнага жыцьця, праводзяць дакладную розьніцу паміж інтарэсамі розных клясаў, паказваюць поўную немагчымасьць выхаду з тупіка пры палітыцы давер'я да ўраду капіталістаў або пры падтрымцы яго.

Становішча цябывала цяжкае. Выхад адзін і толькі адзін: пераход усёй дзяржаўнай улады ў рукі Саветаў Рабочых, Салдацкіх, Сялянскіх і інш. дэпутатаў па ўсёй Расіі, зьнізіў да верху. Толькі пры ўмове пераходу ўлады да рабочай клясы, калі яе падтрымае большасьць сялян, можна разьлічваць на хуткае аднаўленьне давер'я рабочых іншых краін на магутную ўсерасійскую рэвалюцыю, якая зломіць ярмо капіталу і разаб'е жалезныя цісі злачынай бойні народаў. Толькі пры ўмове пераходу ўлады да рабочай клясы, калі яе падтрымае большасьць сялян, можна мець цьвёрдую надзею, што ўсе працоўныя масы з поўным давер'ем адносяцца да гэтай улады і наўстапуць дружна ўсе, як адзін чалавек, на самаадданую работу для перабудовы ўсяго народнага жыцьця ў інтарэсах працоўных мас, а не ў інтарэсах капіталістаў і памешчыкаў. Без такой самаадданай работы, без гігантскага напружаньня сіл усімі і кожным, бяз цьвёрдасьці і рашучасьці перабудаваць жыцьцё па-новаму, бяз самай строгай арганізацыі і таварыскай дысцыпліны ўсіх рабочых і ўсіх бяднейшых сялян, бяз гэтага выхаду няма.

Вайна прывяла ўсё чалавецтва на край пагібелі. Капіталісты ўдягнуліся ў вайну і не ў сілах вырвацца з яе. Перад катастрофай стаіць увесь сьвет.

Таварышы — рабочыя! Набліжаецца час, калі ад вас нарэшце запатрабуюць новага і яшчэ большага гераізму, — і прыгным гераізму мільёнаў і дзесяткаў мільёнаў, — чым у слаўныя дні лютаўскай і кастрычніцкай рэвалюцыі. Рыхтуйцеся!

Рыхтуйцеся і памятайце, што, калі разам з капіталістамі вы маглі перамагчы ў некалькі дзён простым выбухам народнага абурэньня, дык для перамогі супроць капіталістаў і над імі неабходна ня толькі гэта. Для такой перамогі, для ўзяцьця ўлады рабочымі і бяднейшымі сялянамі, для ўтрыманьня яе, для ўмелага выкарыстаньня яе неабходна арганізацыя, арганізацыя і арганізацыя.

Партыя наша дапамагае вам чым можа і, перш за ўсё, прасьвятленьнем сьвядомасьці адносна рознага становішча розных клясаў і рознай сілы іх. Гэтаму прысьвечаны пастановы нашай канфэрэнцыі. Бяз гэтай яснай сьвядомасьці арганізацыя нішто. Без арганізацыі немагчыма дзейнасьць мільёнаў, немагчымы цяжкі посьпех.

Ня верце словам. Не давайце захапіць сябе посухам. Не перапавялічвайце сваіх сіл. Арганізуйцеся па кожным заводзе, у кожным палку і ў кожнай роце, у кожным квартале. Працуйце пад арганізацыяй штодзенна і штогадзінна, працуйце самі, гэтай работы нельга перадаверыць нікому. Дабівайцеся такой работай, каб поўнае давер'е мас да перадавых рабочых складалася паступова, моцна, непарушна. Вось асноўны зьмест усіх пастаноў нашай канфэрэнцыі. Вось галоўны ўрок усяго ходу рэвалюцыі. Вось адзіная зарука посьпеху.

Таварышы — рабочыя! Мы клічам вас да цяжкай, сур'ёзнай, систэмнай работы, якая згуртоўвае сьвядомы рэвалюцыйны пролетарыят усіх краін. Гэты і толькі гэты шлях вядзе да выхаду, да выратаваньня чалавецтва ад жахаў вайны, ад ярма капіталу.

20 красавіка — ўсебеларуская канфэрэнцыя па якасьці харчовай прамысловасьці

Даць краіне больш танных і высока-якасных харчовых прадуктаў —

ПАД ГЭТЫМ БАЯВЫМ ЛЁЗУНГАМ ПАВІННА ПРАЙСЬЦІ УСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ

Перамагчы тормазы на шляху паляпшэньня якасьці работы

(Артыкул члена прэзыдыуму ЦК саюзу рабочых мукамольна-хлебнай і кандытэрскай прамысловасьці СССР — тав. С. Е. Цодзікава

XVII усесаюзная партыйная канфэрэнцыя паставіла, як адну з важнейшых задач прамысловага пляну 1932 году, рашучае паляпшэньне якасьці прадукцыі. Гэта дырэктыва партыі накладае на прафсаюзныя арганізацыі адказнасьць за стварэньне неадкладнага пералому ў галіне паляпшэньня якасьці.

Прадукцыя мукамольна-хлебапякарнай і кандытэрскай прамысловасьці дагэтуль зьяўляецца нездавальняючай.

Стандартнасьць хлеба, напрыклад, у лютым складала 71,8 проц. Стандартнасьць круп у студзені г. г. па прадпрыемствах СССР раўнялася 76 проц. Макаронныя фабрыкі вельмі часта выпускаюць нядобраякасную прадукцыю. Замест бісквітаў таўшчынёй у 8 мм выпускаюцца бісквіты таўшчынёй у 11-12 мм; бываюць выпадкі выпуску бісквітаў з павышанай вільготнасьцю, якая даходзіць да 13-15 проц.

Дзе корань зла? Матар'ялы, якія мае ЦК саюзу, гавораць аб тым, што асноўныя прычыны дрэннай якасьці нарэшце ў вытворчых непаладках, у дрэнным кіраўніцтве тэхналёгічнымі працэсамі.

Цэнтральны Камітэт саюзу мукамольна-хлебнай і кандытэрскай прамысловасьці ў канцы мінулага году правёў месячнік паляпшэньня якасьці печанага хлеба. Да агляду стандартнасьць хлеба па БССР, напрыклад, даходзіла да 64 проц. Пасьля агляду становішча палепшылася: стандарт узьняўся да 81 проц., прычым якасьць хлеба палепшылася пры пагоршаньні якасьці мукі. Гэта гаворыць аб тым, што справа не ў «аб'ектыўных прычынах», а ў правільнай арганізацыі працы, у правільнай расстаноўцы рабсілы і ў штодзённай барацьбе за добрую прадукцыю.

Асноўныя прычыны нездавальняючай якасьці наступныя:

— Адсутнасьць апэрацыйнага штодзённага кіраўніцтва тэхналёгічным працэсам. Ёсьць факты, калі паасобныя брыгады, у пагоні за колькасьцю, пагаршаюць якасьць прадукцыі.

— Адсутнасьць належнага кантролю з боку дзяржаўнай хлебнай інспэкцыі, якая жыве напалову на сродні гаспадарчых аб'яднаньняў і наўрад ці можа бесстаронна кантраляваць якасьць.

— АДСУТНАСЬЦЬ КАНТРОЛЮ РУБЛЁМ з боку гаспадарчых аб'яднаньняў.

— Слабая сувязь лябараторый з заводамі.

— Значна ўплывае на якасьць таксама НЕДАХВАТ ТАРЫ, асабліва ў канды тэрскай прамысловасьці. Біскаіт часта ўпакоўваюць у мяшкі і ў такім відзе накіроўваюць у рабочыя цэнтры. У выніку ён крышыцца.

— Немалую ролю адыгрывае ДРЭННАЕ ТРАНСПАРТАВАНЬНЕ гатовых харчовых прадуктаў, у прыватнасьці хлеба. Нярэдка добры хлеб, які выпускаецца з пякарань і хлебазаводаў, псуецца па дарозе да магазыну, бо транспарт не прыстасован для перавозкі хлеба.

— Сырэц, які паступае на прадпрыемствы, часта не адпавядае нормам стандарту.

На перамаганьне ўсіх гэтых хібаў павінна быць зьвернута ўвага гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый.

Трэба зараз-жа прымацаваць хлебазаводы і мэханізаваныя пякарні да пэўных млыноў з тым, каб заводы ведалі, з якога млыну яны атрымліваюць сырэц і маглі-б уплываць на работнікаў мукамольнай вытворчасьці.

Гэта-ж трэба рабіць у адносінах да макаронных і бісквітных фабрык.

Павінен быць перагледжан склад браніраў на прадпрыемствах; неабходна прапусьціць іх праз спэцыяльныя курсы.

Мэтазгодна паставіць пытаньне аб арганізацыі спэцыяльнага камітэту па якасьці пры СПА, падпарадкоўваўшы яму дзяржаўную хлебную інспэкцыю і іншыя органы кантролю за якасьцю.

Гаспадарчыя арганізацыі павінны ўжыць самыя рашучыя меры да абсталяваньня лябараторый, да забесьпячэньня іх адпаведнымі прыладамі. Трэба арганізаваць рад курсаў па падрыхтоўцы лябарантаў ня менш, як на 1.000 чалавек.

Неабходна з усёй рашучасьцю ўдарыць па тых гаспадарчых аб'яднаньнях, якія не спагняюць штрафаў за дрэнны прадукт. Ударыць рублём па тых, хто дае бракаваную прадукцыю.

Навукова-дасьледчыя інстытуты павінны неадкладна прыступіць да распрацоўкі раду праблем паляпшэньня якасьці прадукцыі.

Прафсаюзныя арганізацыі харча-смакавай прамысловасьці павінны да IX зьезду прафсаюзаў і трэцяй гадавіны сацспабарніцтва арганізаваць ня менш 2.000 брыгад ударнікаў якасьці і сабраць ня менш 8 тысяч рабочых прапаноў.

Харчовая вытворчасьць займае адно з самых ганаровых месц у снабжэньні рабочага спажыўца. Гэта накладвае на яе асабліва сур'ёзныя абавязкі.

Усебеларуская канфэрэнцыя па якасьці харчовай прамысловасьці павінна прайсьці пад баявым лёзунгам: «даць краіне больш танных і добраякасных прадуктаў».

Два важныя пытаньні — у парадак дня

Якасьць прадукцыі мукамольна-крупяной і макаронай вытворчасьці БССР зьяўляецца адным з самых адсталых участкаў харчовай прамысловасьці. Дагэтуль хлебазаводы, макаронныя фабрыкі, кандытэрскія прадпрыемствы атрымліваюць муку, якая зусім не адпавядае стандарту. На рынак выпускаецца нестандартная ячная крупа, нядобраякасныя макароны і г. д.

Надыходзячай канфэрэнцыі па якасьці харчовай прамысловасьці трэба спыніцца на двох важных пытаньнях: **аб паляпшэньні якасьці прадукцыі аб'яднаньняў Наркамснабу і аб хутчэйшым пераходзе да гэтых аб'яднаньняў усіх таварных млыноў.**

Млыны «Саюзмукі», якія знаходзяцца ў БССР, штомесячна выпускаюць 6.000 тон мукі. Яны згуртаваны ў Менску, Гомелі, Воршы, Полацку, Рэчыцы і Слуцку. У Менску працуюць два млыны — імя Дзяржынскага, пададзена пераабсталяваны і тэхнічна прыстасаваны да выпуску стандартнай мукі, і «Адраджэньне», які таксама мае поўную магчымасьць выпускаць добрую прадукцыю. Аднак, паводле даных дзяржаўнай хлебнай інспэкцыі, у 1931 годзе з 740 вагонаў праверанай мукі — 390 вагонаў, або 54 проц. аказаліся нестандартнымі. З праверэных у гэтым годзе 186 вагонаў 97 аказаліся з нестандартнай мукой, што складае 42 проц. Асноўная прычына гэтага — пуск у памол вільготнага збожжа, бо абодва млыны свайго збожжасушыльнага пэху ня маюць. Менскі хлебазавод атрымлівае муку павышанай вільготнасьці, млыны выплачваюць яму скідку на нестандартнасьць і пясуць на гэтым вялікія страты. З гэтым пара пакончыць.

У Гомелі млын выпускае ў суткі 40-45 тон мукі, пры ім ёсьць крупадзёрка. Гэта прадпрыемства за апошні час шмат чаго зрабіла ў галіне паляпшэньня якасьці: вытворчыя нарады вельмі часта абгаварваюць гэта пытаньне, ёсьць кантоўныя рабочыя прапановы ў адносінах якасьці работы. Аднак, і на гомельскім млыне з-за памолу вільготнага збожжа са 191 вагону мукі — 90 вагонаў, або 45 проц. аказаліся нестандартнымі.

Другое пытаньне — гэта пераход у веданьне «Саюзмукі» тых млыноў, якія зьяўляюцца, нібы, дадаткам да іншых прадпрыемстваў, у прыватнасьці лесапілень, і якія ў большасьці выпадкаў знаходзяцца ў бясспрытульным становішчы. Гэтыя млыны павінны як мага хутчэй перайсьці да «Саюзмукі».

Шырокаў.

УДАРНЫЯ БРЫГАДЫ ПА ЯКАСЬЦІ — У АДЗНАКУ КАНФЭРЭНЦЫІ

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Пушчаная ў мінулым годзе макаронная фабрыка імя Леніна зьяўляецца першай і адзінай у БССР. Прадпрыемства абсталявана паводле апошняга слова тэхнікі, выключна замежнымі варштатамі і машынамі.

Фабрыка павінна ў гэтым годзе выпусьціць 8.500 тон розанага роду макаронаў, якія ідуць на спабжэньне рабочых гарадоў БССР, а таксама новых сацыялістычных цэнтраў — Магнітагорску, Кузьнецку і інш.

Фабрыка скончыла першы квартал гэтага году з вельмі добрымі вынікамі: прамфінплян перавыкананы на 2,4 проц., поўнасьцю выкананы якасныя паказальнікі. Гэта гаворыць аб тым, што рабочыя фабрыкі, пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі, па-баявому змагаліся за выкананьне задач, пастаўленых перад імі.

Гаспадарча-разрахунковая брыгада закрутчыц фабрыкі «Камунарка» — паўдарнаму змагаецца за якасьць

Аднак, мы ня можам сказаць, што якасьць макаронаў на належнай вышыні.

Гэты від прадукту вельмі капрызны. Ён патрабуе асабліва ўважлівых адносін да зьмешваньня цеста, да сушкі і г. д. Бываюць часта выпадкі, калі ў цеста трапляе падгта халодная, або гарачая вада, ад чаго пагаршаецца якасьць прадукцыі. З-за няўважлівых адносін да замешваньня цеста, брак прадукцыі часта на 15-20 проц. перавышае плянавую норму.

Вялікае значэньне набывае работа лябараторыі фабрыкі. На гэты участак да апошняга часу не зварачвалі ўвагі. Адна лябарантка, якая ёсьць на фабрыцы, ня можа абслужыць усе 3 зьмены. У выніку атрымліваецца, што пякара кантролю за якасьцю прадукцыі няма. Брак абязьлічан, аб ім ня ведаюць.

Праведзеная на фабрыцы рэдакцыяй «Зьвязды» і «Бальшавіка Барысаўшчыны» нарада па якасьці прадукцыі паказала, што да апошняга часу на фабрыцы не вялася барацьба за добраякасную работу. Рабочыя, выступаўшыя на нарадзе, адзначылі, што сыстэма зарплаты не дае магчымасьці зацікавіць рабочага ў выпуску добрай прадукцыі, бо як за добры прадукт, так і за брак зарплата аднолькавая.

У адзнаку надыходзячай канфэрэнцыі па якасьці рабочыя пастанавілі арганізаваць па ўсіх цэхах і зьменах ударныя брыгады па якасьці. Задача трыкутніка фабрыкі — стаць на чале ўздыму вытворчага энтузіязму рабочых мас.

Сход рабочых ухваліў ініцыятыву рэдакцыі «Зьвязды» і «Бальшавіка Барысаўшчыны» аб скліканьні ў Барысаве нарады па якасьці макаронаў сумесна са спажыўцамі (работнікамі сталовак, бакалейных крам і г. д.).

Што будзе на канфэрэнцыі

20 красавіка а 6 гадзіне ўвечары ў клюбе харчавікоў адкрываецца канфэрэнцыя ўдарнікаў якасьці харчовай прамысловасьці.

На канфэрэнцыю прыбудуць 66 рабочых і ІТР прадпрыемстваў Наркамспабу, 5 работнікаў прылаўку, 40 работнікаў аб'яднаньняў Наркамснабу, Белкаапсаюзу і Стандарткому, а таксама старшыні заўкомаў: аршанскага мясакамбінату, віцебскага маслазаводу і менскіх прадпрыемстваў харчовай вытворчасьці. З правам дарадчага голасу будуць прысутнічаць прадстаўнікі арганізацый, якія загатаўляюць харчовы сырэц.

Канфэрэнцыя заслухае даклад нам. Наркамснабу БССР тав. Васкабойнікава аб рабоце харчовай прамысловасьці БССР. Асноўная праца канфэрэнцыі будзе адбывацца ў секцыях — мукамольна-крупяной, кандытэрскай, бродзільнай і мясной.

Для прэміяваньня лепшых ударнікаў прадпрыемстваў адпушчана 5.000 руб.

Створан штаб па правядзеньні канфэрэнцыі з прадстаўнікоў: «Зьвязды», «Акцябра», Наркамснабу і ЦК саюзаў. Штаб вызначыць для прэміяваньня лепшыя прадпрыемствы, цэхі, брыгады і паасобных ударнікаў.

На канфэрэнцыі будзе арганізавана выстаўка браку прадпрыемстваў харчовай прамысловасьці.

Партыйнае будаўніцтва

За права рашаючага голасу на канфэрэнцыі ўдарнікаў якасьці

Па менскай абутковай ф-цы пытаньне аб якасьці прадукцыі ня выходзіла з парадку дня. Камуністы, камсамольцы і рабочыя-ўдарнікі рашуча выступалі супроць тых, хто гаварыў, што:

— Нам няма чаго гаварыць аб якасьці. Мы павінны змагацца за колькасьць...

Аднак, належных вынікаў ня было. Абязьлічка не давала магчымасьці высьвятліць канкрэтных винаватых у дрэннай работе. Было вядома толькі аб тым, што брак пачынаўся з закройнага цэху. Сярод рабочых хадзіла пагаворка:

— Як скроіш, так і пашыеш.

З мэтай канчатковай ліквідацыі браку, камсамольская ячэйка закройнага цэху паставіла пытаньне перад адміністрацыяй аб арганізацыі ў сваім цэху ўдарнай брыгады моладзі. Ініцыятыва камсамольцаў-закройшчыкаў была ўхвалена цэхавай партыйнай ячэйкай. Ня гледзячы на супраціўленьне з боку адміністрацыі — былога загадчыка цэху Рабіновіча, у закройным цэху была арганізавана першая на фабрыцы ўдарная брыгада.

Першыя дні работы брыгады, з прычыны неарганізаванасьці працы, ня далі належнага эфэкту. Рвачы і прагульшчыкі пачалі папракаць ініцыятараў — камуністаў і камсамольцаў у няжыцьцёвасьці іх прапановы.

На першым сходзе партгрупы, пры актыўным удзеле беспартыйных рабочых, абгаварвалася пытаньне аб выкананьні вытворчых заданьняў членамі і кандыдатамі партыі і камсамольцамі. Партгрупа рашуча асудзіла кандыдата партыі Каца, які сыстэматычна ня выконвае прамфінплян і дае вялікі процант браку. Сход партыйнай групы скончыўся заключэньнем індывідуальных дагавораў паміж асобнымі ўдзельнікамі брыгады, якія бралі на сябе канкрэтныя абавязкі па павялічэньні колькасных і асабліва якасных паказальнікаў. Толькі Кац і Сагаловіч адмовіліся прыняць удзел у спаборніцтве:

— Мы і так добра працуем, а заданьне ў 52 пары выканаць усёроўна немагчыма.

Слова ўзяў ударнік, член партыі тав. Каган. Ён паказаў брыгадзе забракаваны чаравік і коратка сказаў:

— Вось работа такіх, як Кац і Сагаловіч. Мая прапанова — партыйная група павінна даць належнае спагнаньне Кацу, а Сагаловіча ня шкодзіць занесьці на чорную дошку.

Прапанова тав. Кагана была ажыцьцёўлена. Акрамя таго, на сьцяне каля чорнай дошкі былі вывешаны забракаваныя дэталі, зробленыя Сагаловічам і Кацам. Гэтыя мерапрыемствы зрабілі належны ўрыў. Праз некалькі дзён у зводны выкананьня дзённага заданьня па закройным цэху супроць прозьвішчаў Сагаловіча і Каца былі запісаны лічбы, якія паказвалі, што яны значна падцягнуліся ў выкананьні колькасных паказальнікаў і амаль поўнасьцю зьнішчылі брак.

Партыйная група пачала разгортваць масава-растлумачальную работу ў брыгадзе па пераводзе яе на гаспадарчы разрахунак. А ў хуткім часе 17 рабочых гэтай брыгады падалі заяву аб пераходзе на гаспадарчы разрахунак.

Зараз партыйная група ў цэнтр сваёй работы паставіла задачу — узьняць якасьць прадукцыі, дабіцца максымальнай эканоміі хрому. За сакавік месяц старшы брыгадзір Гольдблат перавыканаў вытворчае заданьне на 42 проц., зьвёўшы да мінімуму брак. Аналёгічныя паказальнікі маюць парторг — тав. Голуб і прафорг брыгады — тав. Гурвіч.

Па брыгадным трыкутніку раўняюцца і ўсе іншыя ўдзельнікі брыгады. На аснове сацыялістычных форм і мэтадаў работы, добра наладжанага ўліку яе эфэктыўнасьці, брыгада сыстэматычна выконвае прамфінплян. За сакавік месяц вытворчае заданьне было перавыкананае на 6,9%. За гэты-ж час брыгадай з'эканомлена 10.663 дэцымэтры хрому.

Партыйная група брыгады Гольдблата правільнай арганізацыяй сваёй работы забясьпечыла брыгадзе права атрымаць па канфэрэнцыі ўдарнікаў рашаючы голас.

А. М.

А. СТАЛЕВІЧ

У КРАІНЕ БЕЛАГА ТЭРОРУ

ня дымяць фабрычныя трубы, расьце лес шыбеніц

Характэрнай рысай сучаснага становішча ў Польшчы зьяўляецца круты ўздым рэвалюцыйнага руху рабочых і сялян на базе надзвычай завостранага эканамічнага крызісу. У адказ на наступленьне капіталу, на ўзмоцненую эксплёатацыю, сацыяльнае і нацыянальнае прыгнечаньне, на разгул белага тэрору, працоўныя масы, пад кіраўніцтвам кампартыі, разгортваюць магутныя клясавыя баі, якія ўсё мацней б'юць у падпоры фашысцкай дыктатуры буржуазіі.

Хваля забастовак ахапіла ўвесь край. Асабліва ў прамысловых рашаючых цэнтрах баявым магутным выступленьні ўсё больш шпарка перарастаюць у баі, накіраваныя непасрэдна супроць пануючага фашысцкага рэжыму, перарастаюць у баі за ўладу. У барацьбе супроць наступленьня капіталу, супроць фашысцкага ўраду голаду, шыбеніц і вайны прымаюць удзел **уже асноўныя масы пралетарыяту**, прымаюць удзел рабочыя прамысловасьці ваеннага прызначэньня, рабочыя транспарту, камунальнікі. Пядаўняя забастоўка гарнякоў Дамброўскага басэйну, якая выклікала хвалю салідарных забастовак ва ўсім краі — агульную салідарную забастоўку ў Беластоку, перможная забастоўка тартачнікаў Заходняй Беларусі, бурныя выступленьні беспрацоўных па ўсіх гарадох Польшчы і, урэшце, агульная трохсоттысячная забастоўка 16 сакавіка — вось каротке, але бурны этап разьвіцьця контр-наступленьня пралетарыяту на фашысцкую дыктатуру, вось э якімі баявымі разгорнутымі сьцягамі, шырока разгорнутай барацьбой ідзе пралетарыят усёй Польшчы да сёкетнага першага мая.

Бурнае разьвіцьцё забастовачнай барацьбы пралетарыяту Польшчы і ЗБ, якое наглядаецца за апошнія часы, бязумоўна паслужыць узмацненьню рабоча-сялянскага саюзу, узмацненьню гегемоніі пралетарыяту, будзе спрыяць падняцьцю барацьбы сялянскіх мас на больш высокі палітычны ўзровень. Працоўнае сялянства ЗБ і ЗУ ня схіляецца перад фашысцкім тэрорам, не адступае перад крывавымі «пацыфікацыямі», не паддаецца на фашысцкія і нацыянал-фашысцкія абяцанкі, а **пад кіраўніцтвам кампартыі разгортвае непахісную барацьбу супроць абшарніцка-кулацкай кабалы, за зямлю бяз выкупу, супроць акупацыі, супроць нацыянальнага ўціску.** Цяпер на вёсках Заходняй Беларусі наглядаем пастаянае зьвяшчэньне — захоп усёй грамадой абшарніцкіх і казённых лясоў, складаў з дабром, масавую барацьбу супроць спагнаньня падаткаў, супроць шарваркаў, супроць разгулу белага тэрору.

У барацьбе супроць рэвалюцыйнага руху фашысцкі ўрад ужывае галоўны свой сродак — гэта тэрор, якім ён хоча падтрымаць панаваньне капіталістаў і абшарнікаў. У адказ на рост рэвалюцыйнай барацьбы па завостраныя фермы гэтай барацьбы пануючыя клясы і іх урад уводзяць больш вострыя сродкі задушэньня рэвалюцыйнага руху, уводзяць як адзначае Ленін «чорнасоценныя пагромы і палявыя суды». Гэта і ёсьць цяпер у Польшчы.

Чым больш шпарка парастае рэвалюцыйная сітуацыя, чым бліжэй рашаючыя клясавыя баі, якія нясуць пагібель панаваньню эксплёатуючых клясаў, тым больш асьцервянела кідаецца буржуазія на працоўныя масы, шалёным тэрорам аддягваючы сваю сьмяротную агонію. «Капіталізм не паміраае адразу і тым больш распаліва супраціўляецца, чым бліжэй да сьмерці» (Ленін).

Асабліва пашыран белы тэрор на акупаваных ЗБ і ЗУ, дзе ён вельмі часта выяўляецца ў форме грамадзянскай вайны.

«Кур'ер Вілешскі» ў № 175, у перадавым артыкуле пісаў:

«Трэба забясьпечыць існаваньне нашай «Рэчы паспалітай» Польскай, абвясьціць на «красах усходніх» ваеннае становішча, згуртаваць тут усю энэргію на крывавых расправах з унутраным ворагам, расстрэльваючы штодзённа дзесяткі правадыроў бунтаў, сканцэнтраваць тут усе абарончыя сілы дзяржавы».

Вось апыранаша крывёю словы апалелай ад клясавай нянавісьці буржуазіі, вось лёзунгі імпэрыялістычных акупантаў, якія працягваюць крывавую лапу на новую пажыву, на пашырэньне акупацыі.

На ЗБ і ЗУ, як пляндармах надыходзячай вайны з СССР, асабліва актыўна працуюць палявыя суды, па прыгавору якіх ужо вешаюць цэлымі пачкамі рэвалюцыянэраў. Ужо сотнямі палічваюцца павешаныя, вешаюць рабочых, сялян, жанчын, моладзь. **У Луцку павешан 16-гадовы Александар Грэзьдзель, у Сьвянцянах павешаны дзьве 19-гадовыя дзяўчыны Плотнікава і Севасьцянава.** Па кару сьмерцю можа быць засуджан кожны рабочы і селянін за барацьбу супроць акупацыі, супроць фашысцкага ўраду, калі гэта знойдуць мэтазгодным мясцовыя фашысцкія каты ў сваёй барацьбе супроць узрастаючага рэвалюцыйнага руху.

Карныя экспэдыцыі — усё больш частыя зьявішчы па вёсках Зах. Беларусі. За масавы непладзёж падаткаў, за невыкананьне шарваркаў, за прагон паліцыі і сэквэстратараў і ўсіх акупанцкіх гвалтаўнікоў, паліцэйскія і фашысцкія банды робяць налёты на вёску, разграмляюць маемасьць, праводзяць масавыя катаваньні сялян, масавыя арышты, канфіскуюць апошнія хатнія рэчы.

Зразумела, што галоўны агонь белага тэрору накіраван на авангард рэвалюцыйнага руху — кампартыю, каб пазбавіць рэвалюцыйнага кіраўніцтва працоўныя масы ў іх барацьбе. Усё больш гучна і больш нахабна заклікаюць буржуазныя газэты, фашысцкія палітыкі, ксяндзы да «зьнішчэньня камуністаў», у якіх яны зусім правільна бачаць галоўнага ворага, сваю пагібель.

Гэты заклік старанна рэалізуецца фашысцкім урадам. Пілсудзкага-вешальніка. Калі ў 1927 г. арыштавана за ўдзел у камуністычным руху ва ўсёй Польшчы **5.148 чал.**, дык у 1931 годзе лік палітычных арыштаваных дасягнуў **16.743.** Замучана ў гэтым годзе па дэфэнзывах, расстрэлена па дэманстрацыях **145 чал.**, пакалечана і паранена — **2.813 чал. Лічба гэтых ахвяр белага тэрору шпарка расьце.** У апошнія часы фашысцкія ўлады, шукаючы камуністаў, **правялі масавыя арышты ў Вільні, Берасьці, Слоніме, Горадні. Арыштаваных катуюць, калечаць, забіваюць.** На турмах, дзе сядзяць асужданыя на 8-15 гадоў катаргі, палітзьняволеныя прыроўнены да крымінальных, над імі плянава праводзяцца зьдзекі, асуджаючы іх на павольнае выміраньне.

Ні доўгая катарга, ні катаваньні, ні фашысцкія подкупы і абяцанкі ня могуць зламаць рэвалюцыйнай волі асужданых рабочых і сялян. Яны праводзяць запятую барацьбу і ў сьцепах вастрогу. Фашысцкія працэсы палітзьняволеных ператвараюць у рэвалюцыйныя дэманстрацыі, зварачаюцца з заклікам да працоўных мас змагацца і далей.

Беларускія паслы э клюбу «Змаганьне», будучы асуджаны на 8 год катаргі, прынялі прысуд рэвалюцыйнымі лёзунгамі: «Далоў фашысцкі ўрад», «далоў падрыхтоўку нападу на СССР», «няхай жыве рабоча-сялянскі ўрад і пралетарская рэвалюцыя». За гэтыя лёзунгі паслоў зноў судзіў фашысцкі суд, па якім яны таксама дэманстрацыйна выступілі супроць фашысцкага ўраду, за што былі дадаткова асуджаны на пяўтары гады. За гэтае рэвалюцыйнае выступленьне паслоў зноў пры цягнулі да адказнасьці, але і на **трэці раз** выбраны беларускага народу ня схіліліся перад акупанцкім фашысцкім ботам і з тэй-жа рэвалюцыйнай стойкасьцю выявілі волю шырокіх працоўных мас Заходняй Беларусі.

За рэвалюцыйную барацьбу на фабрыках, маёнтках праводзіцца эканамічны тэрор — выкідваюць з працы на вуліцу, ня прымаюць на работу. Таксама выкідваюць рабочых нацыянальнасьці. Тытунёвая фабрыка ў Горадні, дзе працуе да 1000 рабочых і дзе рабочыя складаліся бадай выключна з яўрэйскай нацыянальнасьці, цяпер заменены польскімі. На чыгунках, дзе была большасьць беларускіх рабочых, апошнія цяпер заменены прывознымі рабочымі з Польшчы, або мясцовымі палякамі. Аднак, фашысцкаму ўраду не ўдаецца яго за хады і манеўры. Крот рэвалюцыі бязупынна ўпарта падточвае падпоры капіталізму ў Польшчы. Рэвалюцыйная барацьба ўзорвае грунт найбольш паваг адсталых пластоў працоўных мас. Працоўныя масы ўсіх нацыянальнасьцяй разгортваюць адзіны рэвалюцыйны інтэрнацыянальны фронт, фронт барацьбы супроць фашысцкага ўраду буржуазіі ўсіх нацыянальнасьцяй. Аб гэтым сьведчыць ажыўленая забастовачная барацьба на чыгунках, на прадпрыемствах ваеннага прызначэньня, словам усюды там, дзе фашысцкі ўрад прымае ўсе меры, каб не дапусьціць да рэвалюцыйнай барацьбы, да ўплыву кампартыі.

Фашысцкі ўрад праз дзікі тэрор хоча запалохаць масы, прыдушыць рэвалюцыйны рух, ачысьціць ЗБ і ЗУ як пляндармы ў надыходзячай вайне супроць СССР. Аднак, яму не ўдаюцца гэтыя пляны. Загнаная ў глыбокае падполье, знаходзячыся пад пастаянным абстрэлам белага тэрору, кампартыя ня толькі ня траціць масавай базы, але яшчэ больш умацоўваецца і павялічвае свае рады. Масы шукаюць партыю, ідуць у партыю і за партыяй. Пад выпрабаваным кіраўніцтвам кампартыі, рабочыя і сяляне раз гортваюць магутныя клясавыя баі, якія часьцей-гусьцей перамагаюць у схватках з фашызмам, ламаюць рамкі белага тэрору. Масавымі паўсюднымі выступленьнямі рабочыя і сяляне ўсёй Польшчы прымусілі ўрад адступіць, вырвалі двух рабочых Тамашова і 14 беспрацоўных з Парушоўца з пяці лі шыбеніц.

Прэса КПЗ

Да 50-годзьдзя з дня сьмерці Ч. Дарвіна

М. Ганчарык

ДАРВІН І КЛЯСАВАЯ БАРАЦЬБА

19 красавіка г. г. мінае 50 год з дня сьмерці вялікага ангельскага вучонага Чарльса Дарвіна, які сваім вучэньнем аб эвалюцыйным разьвіцьці арганічнай прыроды **«паламаў канец поглядам на віды жывёлы і расьлін, як на нічым ня зьвязаныя, выпадковыя, богам створаныя і незьменныя, і ўпяршыню паставіў біялёгію на зусім навуковую глебу, устанавіў зьменлівасьць відаў і пераемнасьць паміж імі...»** (Ленін, т. 1, стар. 72).

У пэрыяд разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне, завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі — у гэты пэрыяд, дату сьмерці вялікага вучонага мы адзначаем для таго, каб яшчэ з большай сілай завастрыць нашу ўвагу на «тэарытычнай прапрацоўцы праблем сацыялістычнага будаўніцтва і клясавай барацьбе пралетарыяту», каб на аснове матэрыялістычнай дыялектыкі Маркса-Энгельса-Леніна і Сталіна зьвязаць канкрэтную прапрацоўку пытаньняў дарвінізму з нашымі бягучымі задачамі па завяршэньні сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі, падвядзеньні пад яе новай тэхнічнай базы і пабудове бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Эвалюцыйнае вучэньне Дарвіна зьявілася ў пэрыяд, які характэрны замацаваньнем гарадзкой буржуазіі і яе прыходу да ўлады на зьмену фэадальнага ладу, калі, як кажа Энгельс: **«У асобе сваёй прадстаўніцы — буржуазіі, прадукцыйныя сілы паўсталі супроць спосабу вытворчасьці, які аба раненецца фэадальным замляўласьніцтвам і цэхавымі майстрамі»** (Людвіг Фэербах, стар. 71).

Да таго часу прыродазнаўчыя навукі і біялёгія грунтаваліся на мэтафізычных мэтадах дасьледваньня і мысьленьня. І толькі пасьля таго, як вывучэньне фактычнага матар'ялу ў такім выглядзе, як ён выглядаўся, дало вялізарнейшы матар'ял, зьявілася магчымасьць і спробы прайсьці да вывучэньня і тых зьмен, якія ў гэтых рэчах адбываюцца. А гэта азначала зусім новы напрамак у разьвіцьці прыродазнаўчых навук. Гэта быў пачатак таго пэрыяду, які палажыў моцны фундамант сучаснай хэміі, вучэньню аб пабудове матэрыі, у тым ліку і арганічнай з прасьцейшых неарганічных элемэнтаў, вучэньню аб газах, устанаўленьню закону захаваньня матэрыі.

У гэты пэрыяд робіцца першы сынтэз арганічнай матэрыі з неарганічнай устанаўляецца Робэртам Майерам закон захаваньня энэргіі, буйна разьвіваюцца такія навукі, як фізіялёгія, эмбрыялёгія, гісталёгія, палеанталёгія. Зьяўляецца вучэньне аб каморкавай будове арганізмаў Шлейдэна і Швана, вучэньне Біша аб сходнасьці тканак і г. д. Зьяўляецца праца Ч. Ляйэля аб гісторыі зямлі, яе эвалюцыі, вызваляецца ад тэлеалёгічных пут фізыка і зьяўляюцца ўсё больш настойлівыя спробы даць тлумачэньне зьявам арганічнай прыроды. Яшчэ Гётэ ў 1786 годзе выказваў думку, што: «Усе расьлінныя формы можна атрымаць ад адной», а ў 1809 годзе зьяўляецца «філёзофія зоалёгіі» Лямарка, у якой ён становіцца на шлях прызнаньня эвалюцыйнага разьвіцьця прыроды. Але Лямарк ня здолеў у сваёй тэорыі эвалюцыі вызваліцца ад тэлеалёгіі. Лямарк рухомую сілу эвалюцыі зводзіць да валявой імкнёнасьці самога арганізму і толькі 50 год пазьней гэта пытаньне па матэрыялістычнай аснове разьвязвае **Дарвін.**

Як бачым, увесь папярэдні гістарычны працэс разьвіцьця прыродазнаўчых навук і філёзофіі, як і пэрыяд бурнага росту капіталізму і прадукцыйных сіл, зьявіўся тым фактарам, які абумовіў і параджэньне эвалюцыйнага вучэньня Дарвіна.

Скарыстаўшы ўвесь багацейшы матар'ял аб арганічнай прыродзе, сабраны да яго, а таксама свае 20-гадовыя нагляданьні, Дарвін прыйшоў да строгай аргумантацыі сваёй тэорыі паходжэньня відаў арганічнай прыроды. Паводле яго эвалюцыйнай тэорыі зьменлівасьць арганізмаў, стварэньне новых форм і відаў, як і зьнікненьне другіх, тая мэтазгоднасьць, якая наглядаецца ў арганічнай прыродзе — зьяўляюцца вынікам настаяннага дзеяньня гістарычнага працэсу, бяз усякага ўдзелу якой-бы там ні было звышнатуральнай містычнай сілы, чым ён адкідае ўсякую тэлеалёгію, напоўнічыну ў разуменьні арганічнай прыроды.

Сваім эвалюцыйным вучэньнем Дарвін ня толькі даў зусім яснае матэрыялістычнае тлумачэньне паходжаньня арганічнай прыроды, але і паказаў, што і чалавек не зьяўляецца нейкай вярхынкай «творчасьці» бога, як нешта вышэйшае, як «цар прыроды», а зьяўляецца вынікам таго самага матэрыялістычнага гістарычнага працэсу эвалюцыі арганізмаў жывёлы.

Пры стварэньні сваёй эвалюцыйнай тэорыі Дарвін стыхійна стаў на дыялектычна - матэрыялістычныя пазыцыі, разбурыўшы пануючыя думкі аб нязьменнасьці існуючага ў прыродзе парадку рэчаў і адсюль, зразумела, тая вострасьць барацьбы, якая зьявілася зараз - жа пасьля зьяўленьня прац Дарвіна і якая не патухае і да гэтага часу.

Супроць Дарвіна апалчыліся мракабесы і рэакцыянэры ўсіх краін, мабілізуючы на гэту справу ўвесь прадажніцкі буржуазны друк скарыстоўваючы ўсе сродкі, пачынаючы з абвінавачваньня самой тэорыі ў ненавуковасьці, выкарыстоўваючы не паасобныя слабыя месцы, грыёмы ўзьдзейнасьці на пачуцьці з пункту гледжаньня хрысьціянскай маралі і даходзячы да адкрытага цкаваньня і зьдзекаў над самім Дарвіным.

Эвалюцыйная тэорыя, паказаўшы паходжаньне чалавека ад жывёлы дапамагла высьветліць сутнасьць тэй **сацыяльнай няроўнасьці,** якая існуе ў клясавым грамадзтве, разьбіла апраўданьне падзелу на бедных і багатых, на «вышэйшых» і «ніжэйшых» рас людзей, што так старанна культывавала і аберагала **рэлігія** — гэты верны паслугач інтарэсаў клясавага панаваньня капіталу.

Побач з гэтым пачаліся спробы скарыстаць вучэньне Дарвіна ў клясавых мэтах буржуазіі, праз адвольнае тлумачэньне эвалюцыйнай тэорыі, спробу падмены рухомага гістарычнага працэсу эвалюцыі асобным пануючым над усёй прыродай законам разьвіцьця і г. д.

Асабліва шырока пускаецца ў ход так званы «сацыяльны дарвінізм» — перанясеньне барацьбы за існаваньне з біялёгіі на чалавечае грамадзтва **(Гекель, Лянге, Плятэ, Озборн, Джэмэнка** і інш.), каб сьцьвердзіць, што пануючая кляса — гэта найбольш прыстасаваная, біялёгічна адабраная, найбольш здольная і, такім чынам, самой прыродай высунутая для панаваньня над другімі, менш прыстасаванымі.

І адсюль апраўданьне тэй няроўнасьці, якая існуе ў клясавым грамадзтве, угрунтаваньне тэй бесчалавечнай экспляатацыі, тых масавых расстрэлаў рабочых, катаваньняў, якія праводзяцца ў засьценках буржуазіі, рабства і ўбойства, у якое кінуты найпырэйшыя масы рабочых і працоўных капіталістычных краін і калёній. Асабліваё пашырэньне «сацыяльны дарвінізм» набывае ў часе імпэрыялістычнай вайны, каб даць вайне **апраўданьне** ў вачох цырокіх працоўных мас **захаваць** яе клясавую імпэрыялістычную сутнасьць.

Найбольш агідным праяўленьнем «сацыяльнага дарвінізму» зьяўляецца прыстасаваньне яго для тлумачэньня расавай праблемы, падзелу нацый і рас на «вышэйшых», «пануючых». Гэта буржуазіі патрэбна для таго, каб замацаваць сваю калёніяльную палітыку, для самай агалцелай экспляатацыі працоўных калёніяльных краін.

Прыкладам найбольш наглых выступленьняў можа служыць заява вядомага біолёга ПАЗШ **Конкліна** 28 студзеня г. г., у якой ён заяўляе, што сучасны крызіс капіталізму і зьвязанае з ім беспрацоўе і галеча працоўных мас выгодна адаб'ецца на біялёгічных уласьцівасьцях рас, паколькі ў выніку галоднага існаваньня вымруць непрыстасаваныя і слабыя і застануцца толькі найбольш моцныя і здольныя.

Гэта агіднасьць, што прапаведуецца «сацыяльнымі дарвіністамі», знаходзіла і знаходзіць сабе самае моцнае падтрыманьне з боку міжнароднага сацыял-фашызму і іх патэнтаваных кіраўнікоў, як **Кауцкі, Баўэр** і інш.

У вырашэньні нацыянальнага пытаньня тэарэтыкі II Інтэрнацыяналу Кауцкі і Баўэр выходзячы з таго - ж «сацыяльнага дарвінізму», адрозьніваючы нацыянальнае пытаньне «цывілізаваных» народаў ад калёніяльных, прапаведуючы гэта **ДЛЯ АПРАЎДАНЬНЯ** наступленьня буржуазіі на жыцьцёвы ўзровень рабочай клясы, экспляатацыі і рабства калёніяльных народаў, **для арганізацыі НОВАЙ ВАЙНЫ** супроць бацькаўшчыны міжнароднага пралетарыяту—Савецкага Саюзу. На гэтай-жа пазыцыі «сацыяльнага дарвінізму» стаіць і контр-рэвалюцыянэр **Троцкі,** які сьцьвярджае, што **ў шырокім матэрыялістычным і дыялектычным сэнсе марксызм зьяўляецца прыстасаваньнем дарвінізму да чалавечага грамадзтва».**

Ня менш энэргічныя спробы мы наглядзем і ў напрамку прымірэньня дарвінізму з рэлігіяй. Наглядным прыкладам гэтага можа служыць **адзін з ганебнейшых дакумантаў** сучаснай каталіцкай «цывілізацыі»—**малпавы працэс у ПАЗШ.**

У СССР—краіне пралетарскай дыктатуры—барацьба вакол матэрыялістычнага разуменьня прыроды ў большасьці набывае замаскаваныя формы. У гэтым напрамку асабліва характэрнымі зьяўляюцца пропаведзі «сацыяльнага дарвінізму» праф. Філіпчанка і Кальцова, калі яны імкнуцца даказаць, што толькі буржуазія зьяўляецца здольнай, прыродай адоранай для навуковай працы, што навука не па плячы рабочай клясы.

Пралетарыят Савецкага Саюзу пад кіраўніцтвам партыі дабіўся вялізарных перамог у справе стварэньня тэхнічнай інтэлігенцыі з людзей рабочай клясы на ўсіх без выключэньня ўчастках навукі і тэхнікі гэтага ня бачаць, або ня хочуць бачыць рэнэгаты ўсіх масьцей.

Адзначаючы вялізарныя заслугі Дарвіна ў гісторыі біялёгічных навук, мы, аднак, не бярэм дарвінізм дагматычна. Маркс, Энгельс і Ленін падкрэсьлівалі ў вучэньні Дарвіна істотныя недахопы, якія вынікалі з буржуазнай абмежаванасьці самога Дарвіна і тагочаснага стану біялёгічнай навукі. Энгельс у «Анты-Дзюрынгу» пісаў: **«Сама тэорыя разьвіцьця яшчэ вельмі маладая і таму няма сумненьня, што да лейшыя досьледы прывядуць да вельмі значнага відазьмену цяперашніх, у тым ліку строга-дарвінскіх уяўленьняў аб ходзе разьвіцьця відаў».**

У сваім лісьце да Энгельса Карл Маркс падкрэсьліваў, што кніга Дарвіна «Паходжаньне відаў» **«дае прыродна-гістарычную аснову нашым поглядам».**

У работах Энгельса і Леніна мы знаходзім выстарчальныя ўказаньні ня толькі на паасобныя недахопы ў дарвінскім вучэньні, але і вызначэньне шляхоў, па якіх павінна пайсьці далейшая распрацоўка спадчыны Дарвіна.

Тады, як капіталістычны сьвет аказ ваецца зусім няздольным да стварэньня якой-небудзь новай прагрэсыўнай думкі, калі буржуазная навука ўсё больш і больш акунаецца ў містыку і тэлеалёгію, ва ўмовах Савецкага Саюзу на аснове рэвалюцыйнай тэорыі Маркса - Энгельса - Леніна - Сталіна, ёсьць усе магчымасьці паглыбіць тэарытычную распрацоўку эвалюцыйных ідэй Дарвіна на карысьць будаўніцтва сацыялізму, на карысьць рэвалюцыйнага ўзбраеньня пралетарыяту ў яго барацьбе за сусьветны Кастрычнік.

Зараз у пэрыяд абвострнай клясавай барацьбы мы павінны весьці самае бязьлітаснае змаганьне супроць усякіх адхіленьняў ад мэтадалёгіі марксызму - ленінізму, супроць мэханіцызму як галоўнай небясьпекі на даным этапе, меншавіцтвуючага ідэалізму і прымірэнцтва. Барацьба на два фронты ў пытаньнях распрацоўкі ідэй дарвінізму вымагаецца яшчэ і тым, што мы сустракаем рад істотніх скажэньняў з боку мэханістаў, якія ня могуць, або ня хочуць разумець рашаючага ў марксыцка-ленінскай мэтадалёгіі—рэвалюцыйнага вучэньня аб разьвіцьці, дыялектыцы, згодным здрадзіць дыялектычнаму матэрыялізму ў карысьць любога буржуазнага вучэньня, толькі-б яно зьвінела «матэрыялістычна» (Обух, Багалепава, Сераброўскі і інш.).

Нельга аслабляць барацьбы супроць меншавіцтвуючых ідэалістаў, якія здольны любы рэакцыйны зьмест усякіх «навейшых дасягненьняў» буржуазнай ідэалёгіі ўціснуць у «дыялектычныя формулы» (Левіт, Агол, Левін і інш.).

Толькі на аснове непрымірымай барацьбы на два фронты мы зможам праз дыялектычны матэрыялізм узяць усё лепшае з буржуазнай навукі, пасунуць наперад распрацоўку эвалюцыйных ідэй Дарвіна, перамагчы яго недахопы і па аснове марксызму-ленінізму ўзьняць біялёгію на новую вышыню, якая будзе адпавядаць вялікім задачам будаўніцтва сацыялізму ў СССР і пралетарскай рэвалюцыі ва ўсім сьвеце.

Дэкаднік БАН у Віцебску і Гомелі

З 20 па 30 красавіка Беларуская Акадэмія Навук арганізуе ў двух буйнейшых прамысловых і культурных цэнтрах БССР — **Віцебску і Гомелі** дэкаднік.

У плян дэкадніка ўключана па 10 дакладаў на актуальнейшыя тэмы: **«Клясавы вораг на гістарычным фронце Беларусі», «Крызіс буржуазнай культуры ў капіталістычных краінах і рост пралетарскай культуры ў СССР», «Праблема электрафікацыі БССР у другой пяцігодцы», «Хэмізацыя БССР», «Рэлігія і ярэйскі сацыял - фашызм», «Падрыхтоўка да вайны ў заходня - эўрапэйскай літаратуры», «Другая пяцігодка БССР», «Аб рабоце Беларускай Акадэміі Навук і перспэктывы навукова - дасьледчай работы ў другой пяцігодцы»,** і інш.

У дэкадніку прымаюць удзел акадэмікі: **Панкевіч, Вальфсон, Пятровіч, Шчарбакоў,** праф. **Прыляжаеў.** Навуковыя працаўнікі: **Гальперына, Левін, Карнеенка, Нодкін,** пралетарскі пісьменьнік — Александровіч і інш.

Даклады з гомельскага радыё - вузла будуць трансьляваца па ўсёй БССР. Некаторыя з іх у кароткім зьмосьце будуць перададены з Менскай радыё - станцыі і надрукаваны ў газэтах.

Аб самавольстве раду працаўнікоў Растоўскага гарсавету

Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 15 красавіка

Факты, выкананыя ў самае тав. Янчэўскай, прысланай у ЦК партыі, аб высяленьні яе сям'і з другіх рабочых сем'яў гораду Растова з дому, які належыць рэдакцыі газэты «Молот», а таксама факты, якія выявіліся пры высьвятленьні справы на месцы аб высяленьні тав. Янчэўскай і іншых сьведчаць аб наяўнасьці гоніта адміністраваньня і бяздушных адносін да працоўных у радзе кіруючых працаўнікоў Растоўскага на Доне гарсавету.

Высяленьне сям'і тав. Янчэўскай з малымі хворымі дзецьмі ўночы ў сырыя пакоі недабудаванага дому, а таксама перасяленьне сям'і рабочага з хворай жонкай, якая толькі што вярнулася з больніцы, з трудным дзіцём у абсалютна сыры пакой без сьвятла і вады і рад іншых аналёгічных фактаў, выкарыстоўваньне фірмы газэты «Рабочий Ростов» рэдактарам гэтай газэты для нацёску на работнікаў гарсавету ў мотах хутчэйшага высяленьня жыльцоў з намечанага для гэтай газэты памяшканьня — усе гэтыя пералічаныя абурэчыя факты пацьвярджаюць, што паасобныя кіруючыя працаўнікі - камуністы пагрузьлі ў бюракратычным адміністраваньні і ня бачаць жывых людзей.

ЦК УсеКП(б) пастанаўляе:

1. За бюракратычныя і бяздушныя адносіны да інтарэсаў выселеных сем'яў працоўных і за падбор у апарат гарсавету і РУНІ грубых і бяздушных бюракратычных выканаўцаў старшымі Растоўскага гарсавету тав. **ІВАНОВУ** абвясьціць суровую вымову.

2. Нам. старшыні Паўночна - Каўказкага краю КК-РСІ тав. **ІЛЬНІЦКАМУ,** да якога ня раз зварачалася тав. Янчэўская і які ўзяўся за прыпыненьне высяленьня, але ня змог давесьці свае ўказаньні да канца і зьнічыць недапушчальныя мэтады, якія ўжываліся да выселеных, абвясьціць вымову.

3. Рэдактара газэты «Рабочий Ростов» тав. **ТАВАРОЎСКАГА** за запалох ваньне работнікаў РУНІ пагрозай вымясьціць сыроць іх артыкул з іх картрэтамі ў першым - жа нумары газэты ў выпадку, калі яны бескладцца на высяленьне гэту групу жыльцоў і ня вызваляць іх, кватэр над памяшканьне для рэдакцыі газэты, зьняць з работы і абвясьціць яму суровую вымову з папярэджаньнем.

4. Адказнага сакратара і члена пра зыдыуму гарсавету **ШЫРОКАВА,** які асабіста аглядаў кватэры, у якіх высялялі пазаказную групу жыльцоў і які перакінуўся ў іх пакрыўдзенасьці для жыльля і, ня гледзячы на гэта, абазвяўшага работнікаў РУНІ пад пагрозай звальненьня зрабіць гэрбінова высяленьне, выключыць з партыі і зьняць з работы.

5. Загадчыка РУНІ **Гладзілава** і заг. кватэрным сэктарам РУНІ **ЦІРА** за беззаконныя мэтады перасяленьня і за бяздушныя чыноўніцкія адносіны да выкананьня сваіх абавязкаў — выключыць з партыі і зьняць з работы.

6. Прыняць да ведама, што Паўночна - Каўказкі краёвы парткамітэт і крайвыканком прымуць меры да тэрміновага зьнічэньня ганебнасьцей, аналёгічных допушчаным працаўнікамі растоўскага гарсавету і прадастаўляюць выселеным жыльцом прыгодныя для жыльля памяшканьні.

ЦК УсеКП(б).

Дапамагчы вучням Біра-Біджану

Рэдакцыя **«Юнгер ленінец»** атрымала ліст ад вучняў Біра - Біджану, у якім яны расказваюць аб посьпехах сапыялістычнага і нацыянальна - культурнага будаўніцтва. Адначасова вучні ставяць пытаньне аб тым разрыве паміж тэарытычнай і практычнай работай, які ў іх ёсьць. Вучні ня маюць магчымасьці наладзіць як сьлед работы па палітэхнізацыі школы з-за недахвату майстэрань і палітэхнічнага абсталяваньня.

Газэта «Юнгер ленінец» узьняла пытаньне аб зборы сродкаў на культвагон з палітэхнічным абсталяваньнем для вучняў Біра - Біджану, разгляда даючы гэта пытаньне, як крок па выкананьні задач шэфства над Біра-Біджанам.

На нашу прапанову адгукнулася многа піянэрскіх баз і школ Беларусі. Уключыліся такія арганізацыі, як ЦВК БССР, ЦСПСБ, Менгарпрафсавет, Чырвоны Крыж, Аўтадор і газэты: «Піянэр Беларусі» і «Юнгер Арбэйтэр».

Збор сродкаў праводзіцца праз БелАЗЭТ, які прапанаваў усім сваім арганізацыям неадкладна ўключыцца ў кампанію.

МенАЗЭТ для набыцьця палітэхнічнага абсталяваньня вучням Біра-Біджану арганізоўвае 23 красавіка спэцыяльны вечар у Яўрэйскім Дзяржаўным тэатры. Яўрэйскі тэатр абавязаўся правесьці скарбоначныя зборы ў часе новай пастаноўкі «Партызаны».

Мы зварачаемся да ўсіх прадпрыемстваў, рабочых, калгасьнікаў, камсамольскіх калектываў БССР уключыцца ў правядзеньне збору сродкаў на набыцьцё палітэхнічнага абсталяваньня.

У першамайскія сьвяты вагон з палітэхнічным абсталяваньнем павінен быць адпраўлен у Біра-Біджан з тым, каб піянэрская арганізацыя Біра-Біджану, адзначаючы 10-годзьдзе піянэры, атрымала падарунак беларускіх працоўных.

Рэдакцыя «Юнгер ленінец».

Мацаваць інтэрнацыянальную сувязь

Справа арганізацыі Біра - Біджанскага яўрэйскага нацыянальнага раёну, які ў сваім разьвіцьці мае ператварыцца ў аўтаномную яўрэйскую нацыянальную адзінку Саюзу ССР, мае вялізарнейшае палітычнае і гаспадарчае значэньне. Першыя перасяленцы ў Біра - Біджан — піянэры Біра - Біджану павінны атрымаць магутнае падтрыманьне з боку ўсёй пралетарскай грамадзкасьці Саюзу ССР і ў першую чаргу з боку грамадзкасьці БССР — шэфу Біра - Біджану.

З гэтае прычыны пачын газэты «Юнгер ленінец» аб арганізацыі вагону з палітэхнічным абсталяваньнем для вучняў Біра - Біджану павінен знайсьці водгук ва ўсёй пралетарскай грамадзкасьці БССР.

Прывітаньне «Юнгер ленінцу»! Усе на дапамогу Біра - Біджану!

А. ЧАРВЯКОЎ.

Вопыт лепшых--адстаючым

Работа паравоза залежыць ад машыніста

Паравоз Щ-1685 імя XIV партзьезду замацован за намі каля году. Перад гэтым ён быў поўным інвалідам, ад яго адмаўляліся ўсе машыністы.

Мы пачалі сумесна настойліва дабівацца аздараўленьня паравоза. Гэта работа ішла па некалькіх шляхох. Галоўнейшую ролю адыгрывалі ў гэтай справе нашы паравозныя вытворчыя нарады. Кожны раз пасьля звароту

Машыніст ВІГДОРЧЫК

паравозу з дарогі, мы сумесна (абедзьве брыгады) рабілі агляд яго. Пасьля гэтага на вытворчай нарадзе абмяркоўвалі мэтады ліквідацыі недахопаў у яго рабоце.

З першых дзён брыгадзе было цяжка спраўляцца з паравозам, у якога ўсе часьці былі зношаны. Паравоз больш стаяў у дэпо на рамонце, чым працаваў. Мы перш за ўсё ўзяліся за павышэньне якасьці рамонту. Сачылі за работай рамонтных брыгад, а дробны рамонт праводзілі самі.

Чым больш паравоз прыводзіўся ў здаровы стан, тым лягчэй было выкопваць вызначаныя вымяральнікі. Ня гледзячы на тое, што ён зьяўляецца тэхнічна горш ўдасканаленым (поўнасьцю жалезная топка) і мае значныя дэфэкты, якія ад нас не залежаць (рашоткі дымагарных труб выгнуты на 12 мм.), мы ўсё-ж дабіліся на ім значных посьпехаў.

У першым усебеларускім конкурсе мы на нашым паравозе далі наступныя паказальнікі: за сьнежань 1931 г. прабег — 100 проц., эканомія апалу— 19 проц., змазачных матар'ялаў — 3 проц., сьледваньне паводле раскладу — 100 проц., нагон спазьненьняў — 8 г. 57 мін.; у студзені месяцы 1932 году па прабегу далі 112 проц., эканомії апалу — 26 проц., змазачных матар'ялаў — 24 проц., сьледваньне паводле раскладу — 100 проц. і нагон спазьненьняў — 13 гадз. 19 мін.

За першыя 15 дзён другога ўсебеларускага конкурсу па прабегу заданьне выканана на 101,65 проц., эканомія апалу — 20,41 проц., змазачных матар'ялаў—6,07 проц., нагон спазьненьняў — 180 мін., пры агульнай ацэнцы ў 299,72 бала. За другую палову сакавіка паводле няпоўных падлікаў мы маем эканомію апалу на 23 проц.

Эканоміі апалу мы дабіліся шляхам дэталёвага вывучэньня профілю дарогі і 100 проц. скарыстаньня коксу і ізгары пярэдніх топак, якія раней не скарыстоўваліся.

Ад прамыўкі да прамыўкі наш паравоз строга выконвае норму прабегу ў 2.200 клм.

За ўвесь час работы нашай спаранай брыгады ня было ніводнага спазьненьня на работу, а таксама і зрыву спаранай язды. Ня было ніводнага спазьненьня падачы паравозу пад цягнік.

Наша брыгада прымае актыўны ўдзел у грамадзкай рабоце. Увесь склад брыгад, апрача качагараў, якія надаўка пачалі працаваць, мае грамадзкія нагрузкі. На кожнай вытворчай нарадзе мы адпускаем гадзіну на прапрацоўку дырэктыў партыі. Намі прапрацаваны пастановы пленумаў ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б аб транспарце, пастановы XIV зьезду КП(б)Б і XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі. Намі дэталёва прапрацован і ўсьведомлен загад Наркома шляхоў зносін тав. **Андрэева.** Толькі поўнае ўсьведамленьне брыгадай палітычных задач і правільнае кіраўніцтва партарганізацыі далі нам магчымасьць дабіцца тых посьпехаў, якія мы зараз маем.

Мы ўпэўніліся, што выкананьне плянаў залежыць ня столькі ад паравоза, колькі ад людзей, якія на ім працуюць.

Дабіўшыся значных перамог у справе аздараўленьня свайго паравоза, мы абяцаем яшчэ больш прыналегчы на павышэньне тэмпаў і якасьці. У мэтах перадаваньня вопыту, мы бярэм шэфства над адстаючымі паравозамі Щ-414 і Щ-557. Абавязуемся прымаць удзел у іх вытворчых нарадах і пры рамонце іх паравозаў, а таксама упягваць іх у работу сваіх вытворчых нарад.

Машыніст СЕНАЖЭНСКІ

Будзем змагацца за павышэньне тэхнічных ведаў усёй брыгады. Мы ставім задачай падрыхтаваць з памочнікаў—машыністаў, а з качагараў—памочнікаў машыністаў.

Запэўняем партыю і ўсю работную клясу, што ўзятыя на сябе абавязкі выканаем.

Вігдорчык, Сенажэнскі.

Менская гарадзкая канфэрэнцыя Асоавіяхіму

Ператварыць Асоавіяхім у сапраўдны рэзэрв Чырвонай арміі

Сорэчкі па дакладах ЦС і гарсавету Асоавіяхіму

У сорэчках па дакладах Цэнтральнага і гарадзкога саветаў Асоавіяхіму выказалася 17 асоб.

Тав. Чуклай (камвуз) адзначыў, што многія ячэйкі менскай арганізацыі Асоавіяхіму ня справіліся з задачамі, што стаялі перад імі ў галіне ўзмацнаньня абароназдольнасьці краіны. Асноўны лёзунг ператварэньня арганізацыі ў рэзэрв Чырвонай арміі далёка яшчэ не ажыцьцёўлен. Гарсавет Асоавіяхіму справаў арганізацыйна-старшынны, паперовы. Работа гарсавету ня была сканцэнтравана па ўзмацненьні ніязьвых сьвеньняў.

У нас, у камвузе,—кажа т. Чуклай,—працуюць два спраўковыя гурткі і гурток па вывучэньні аўтатрактарнай справы, але з прычыны пэўтэжкі работы паміж мясцовымі арганізацыямі, запаткі часта прыпыняюцца. Невыстарчальна наладжана дысцыпліна.

Тав. Георгіеўскі зьвярнуў увагу дэлегатаў на неабходнасьць аўладаньня вайсковай тэхнікай. Далей ён падкрэсьлівае, што сувязь паміж ячэйкамі вайсковымі і грамадзянскімі зусім невыстарчальная, яна носіць кампанейскі характар.

Тав. Ячка (завод «Бальшэвік») гаварыў аб нездавальняючай дапамозе ў наладжаньні вайсковай работы з боку заводу. На заводзе ёсьць многа камандзнага складу запасу, але ён не скарыстоўваецца на вайсковай рабоце. Значна адбіваецца на рабоце адсутнасьць сакратароў асоавіяхімаўскіх ячэек. Прымацаваньне па заводу работнікі гарсавету Асоавіяхіму бязьдзейнічаюць і смаль нікой на заводзе ня бываюць.

Тав. Бацьвінік (ЦС Асоавіяхіму) тлумачыць невыстарчальную асоавіяхімаўскую работу па гораде тым, што гэта работа не прасякнута была сацыялістычнымі мэтадамі.

Тав. Даўгабрысаў адзначыў, што гарсаветам ня быў узят курс на ўзмацненьне вайсковай работы на вядучых прадпрыемствах гораду, а работа гэта ясьціла расплывны характар. Ёсьць некаторы разрыў паміж пучэбным пунктам і асоавіяхімаўскай ячэйкай. Так, напрыклад, па заводзе імя Варашылава ўжо калі паўтара месяца ня спрацуе пучэбны пункт, адтак, ячэйка ня ацэньвіцца гэтым і не зьяўляецца штурмагам палепшэньня вайсковай работы. Міжнародная абстаноўка, — кажа тав. Даўгабрысаў,—патрабуе ад нас тэрміновага палепшэньня якасьці вайсковай работы.

Тав. Янкович (гаркам КП(б)Б) жыцьць, што тав. Назасёлаў у сваім дакладзе не разгарнуў належнай самакрытыкі, ня прыняў тых недахопаў, якія былі ў рабоце апарату гарсавету. Гаркам КП(б)Б, саслухоўваючы справаздачу гарсавету, прыняў вайсковую работу нездавальняючай, даў рад канкрэтных указаньняў па палепшэньні работы. Адтак, і да гэтага часу прыкметнага палепшэньня няма. Рад прадпрыемстваў (завод «Дрэваапрацоўчых») яшчэ да сёньняшняга дня нездаволены вялікасьці вайсковай работы. Між тым, гарсаветам ня зроблена па гэтым адзначаным арганізацыйным вынікам. Былі ў некаторых гарадзкіх ячэйках ёсьць посьпехі ў галіне вайсковай работы, цяк у сацыялістычным сэктары вёскі апошняя спатвецца самым адстаючым участкам.

Асноўны недахоп работы гарсавету заключаецца ў бясплянасьці. Ня было цесной сувязі ў рабоце, якая праводзілася з гаркомам камсамолу. Работа праходзіла па-кампанейску. Ня было сыстэматычнай барацьбы за аўладаньне вайсковай тэхнікай.

Значную віну за слабую вайсковую работу трэба ўскласьці і на гарпрафсавет, які стаяў осьбім у баку ад вайсковай работы і не даваў смаль сёйкіх указаньняў пізам па яе палепшэньні. У выніку ўзарвіні вытворчасьці яшчэ ў значнай сваёй частцы ня сталі ўдарнікамі абароны краіны.

Цэнтральны савет Асоавіяхіму таксама не аказаў патрэбнай дапамогі гарсавету і ня ўжыў мер па палепшэньні работы (т. **Эфрос,** гаркам КП(б)Б).

Выступаўшы **тав. Гантман** (ЦС Асоавіяхіму) адзначыў невыстарчальную работу вучучэйстаў па аўладаньні тэхнікай справы і пазначыў гэта тым, што большасьць пунктаў не стварыла ніякае сабе актыву, які-б дапамагаў узмацненьню работы. Камсамольскі страляцкі паход і конкурс, які праходзіць зараз па ўсім Савецкім Саюзе, па менскай арганізацыі яшчэ фактычна не пачынаўся. Страляцкі сэктар гарадзкога савету, ня гледзячы на пляніку колькасьці інструктароў, ня стаў ініцыятарам гэтага важнейшага мерапрыемства.

Тав. Лысякоў (АБВШ) скарджуўся на невыстарчальнае кіраўніцтва з боку гарсавету вайсковымі ячэйкамі Асоавіяхіму. Вельмі нізкі процант у арганізацыі жанчын (у БССР — 44 проц.), што бязумоўна зьяўляецца вынікам невыстарчальнай работы сярод іх. Слабыя вучасткам работы гарсавету яшчэ і дагэтуль зьяўляецца шэфработа, якая ня носіць сыстэматычнага характару, а праводзіцца па-кампанейску.

—Самым адсталым вучасткам, — адзначае выступаўшы тав. **Бубнікоў** (Самахвалавічы), — зьяўляецца вайсковая работа ў сацыялістычным сэктары вёскі. Перабудова работы ў калгасных і саўгасных ячэйках у большасьці яшчэ не пачыналася.

Тав. Багачоў (каварпус) зрабіў асноўны ўпор на палепшэньне якасьці вайсковай работы. Будучая вайна,— кажа ён,— будзе патрабаваць ад нас вялікай колькасьці добра падрыхтаванага рэзэрву для Чырвонай арміі, якога яшчэ і цяпер няма ў асоавіяхімаўскай арганізацыі.

Прадстаўнік Ленінскага гарсавету Асоавіяхіму **тав. Занінкаў** адзначыў, што абпобская арганізацыя раней яшчэ рад прарывала ў галіне вайсковай работы. Адтак, калі мы па-бальшавіцку ўзяліся за перабудову работы па-новаму, праводзілі ўсю работу на аснове сацыяборніцтва і ўдарніцтва, пракалілі 6 указаньняў тав. **Сталіна,** арганізацыя прышла да сваёй канферэнцыі з вялікімі перамогамі. Буйнейшы завод у Віцебску **«Чырвоны мэталіст»** ператварыўся ў сапраўдную крэпасьць абароны краіны. За ўзорную вайсковую работу завод узнагароджан чырвоным сьцягам. «Чырвоны мэталіст» пыхкіўку на сад спаборніцтва завод імя Варашылава, але па працягу 6 месяцаў ад варашылаўцаў не атрымана ніякага адказу.

Сацыялістычны сэктар вёскі па вайсковай рабоце галасма не адстае ад горану. Ёсьць саўгас, калгас пры ячэйку асоавіяхіму. Для вайсковай работы ў гэтых ячэйках створаны перспэктыўныя вайсковыя школы. (Пры буйных фабрыках і заводах гораду арганізаваны і працуюць 25 саветаў Асоавіяхіму. Гаты-ж саветы створаны ў значнай частцы калгасаў і саўгасаў. Зараз па гораде пайчэпецца каля 80 ударных брыгад імя Асоавіяхіму, 4 ударныя пэхі па асоавіяхімаўскай рабоце. Ёсьць грамадзянская авіяшкола, якая рыхтуе лётчыкаў.

Ня так даўно пасьлі менскай і абласной арганізацыямі Асоавіяхіму заключан сацыялістычны дагавор на лепшую вайсковую работу. Гэты дагавор яшчэ больш згуртуе іншы розум на барацьбу за аўладаньне вайсковай тэхнікай.

Новы склад прэзыдыуму Менскага гарадзкога савету Асоавіяхіму

Пленум менскага гарадзкога савету Асоавіяхіму першага скліканьня выбраў у склад прэзыдыуму гарсавету наступных таварышоў: **Верачава, Гальперыну, Георгіеўскага, Гросс, Іванова, Казлоўскую, Кукуева, Мацюкова, Млодзка, Навасёлава, Пастоўскага, Ротава, Хінава, Шыбка, Шэлег, Чарнка і Эфрос.**

Старшынёю гарсавету Асоавіяхіму выбран тав. **Мацюкоў.**

Японія рыхтуецца да аднаўленьня ваенных дзеяньняў

Сігеміцу пагражае аднаўленьнем ваенных дзеяньняў

ВАШЫНГТОН, 14. У сувязі з паведамленьнем з Шанхаю, што Сігеміцу пагражае аднаўленьне ваенных дзеяньняў, чыноўнікі міністэрства замежных спраў заяўляюць, што яны ня зьвяз'ілены гэтым. Яны лічаць, што намеры Сігеміцу зьяўляюцца лёгічным разьвіцьцём японскай палітыкі, пачынаючы з верасьня мінулага году. Па іх думцы ПАЗШ будуць уважліва сачыць за дзеяньнямі японцаў, у той самы час прытрымліваючыся палітыкі, абвешчанай у ноце ПАЗШ ад 7 студзеня і ў лісьце Стымсона сэнатару Бора. Да гэтага часу ў дзярждэпартаманце выказваюць надзею, што фінансавы крызіс і ўнутрышпалітычнае становішча Японіі прымусяць яе зьмяніць сваю палітыку. Зараз-жа адзін выдатны прадстаўнік дэпартаманту прызнаў, што прыходзіцца адмовіцца ад гэтых надзей і заявіў, што Японія рашуча ідзе на шляху, вызначаным загадзя ўстаноўленым плянам экспансіі і ня ўступіць, пакуль ня будзе аказан паніск звонку». Некаторыя чыноўнікі дэпартаманту стаяць на тым пункце погляду, што прамова Тард'е ў Жэнэве ўзмацніе пазыцыю Японіі, паколькі не парушае надзеі на магчымасьць скарачэньня ўзбраеньняў у гэтым годзе (ТАСС).

Самы сур'ёзны бой пасьля эвакуацыі Чапэю

Японцы пусьцілі ў ход цяжкую артылерыю

ШАНХАЙ, 17. Газэта «Чайна прэс» паведамляе, што ўчора адбылася сутычка паміж японскімі і кітайскімі войскамі, **якая зьяўляецца самай сур'ёзнай бойкай з часу эвакуацыі Чапэю.**

Сутычка адбылася наступным чынам: атрад японскай пяхоты пасунуўся наперад і адкрыў агонь на кітайскіх пазыцыях. Нечаканае выступленьне японскіх войск было падтрымана агнём цяжкай артылерыі. Бойка адбывалася недалёка ад Яўлінто, на поўнач ад Люхэ. Другія паведамленьні таксама пацьвярджаюць, што **японская цяжкая артылерыя пачала бамбардыроўку кітайскіх пазыцый і сьледам за гэтым японская пяхота пачала наступленьне.** Паведамляюць, што кітайцы ў пачатку адступілі на некаторую адлегласьць, але хутка прыбылі падмацаваньні і японскія атакі былі адбіты.

Газэта «Чайна прэс» паведамляе, што японцы падкладалі міны пад магільнымі ўзгоркамі ў раёне Чэнчжу і ў раёне на паўночны ўсход ад Інсяндзяня, дзе дабудаваны траншэі.

Цай Тін-кай (камандуючы 19 кантонскай арміяй) учора зрабіў агляд кітайскіх лініі ў раёне Тайцана. 5.000 кітайскіх войск, якія былі расквартаваны ў раёне Люхэ, будуюць электрычныя дротавыя загарожы.

Японскія войскі канцэнтруюцца вакол Люхэ, Сінтана і Фуцзяо, адначасова ў раёне Нанкіна знаходзіцца японская пяхота ў складзе 8 тыс. штыхоў і аднаго дывізіёну артылерыі. У гэтым раёне таксама канаюцца акопы для шматлікай палявой артылерыі. Жэрлы гарматаў накіраваны на Хуанду.

У горадзе Тайцан арыштавана шмат японскіх шпікоў. Японскія самалёты штодзенна робяць разьведвацельныя палёты (ТАСС).

Японія сьцягвае войскі ў Манчжурыю

ТОКІЁ, 16. Распачатая 12 красавіка адпраўка з Японіі ў Манчжурыю часьцей 8-10 дывізій працягваецца. **Амаль штодня ў Манчжурыю адпраўляюцца новыя часьці.** 16 красавіка з Кобе адпраўлена 700 салдат з палкоў Ціба і Тапікава. Агенцтва Сімбун Рэнга паведамляе, што ваеннае міністэрства распрацавала дадатковы бюджэт ваеннага ведамства, паводле якога да канца бюджэтнага году на ваенныя расходы ў Манчжурыі і Шанхаі асыгнуецца звыш 200 млн. іен. Маркуюць, што новы праект прадугледжвае павялічэньне японскіх войск у Манчжурыі. Агенцтва Сімбун Рэнга паведамляе з Мукдэну, што часьці 10-й японскай дывізіі замест Шанхаю 13 красавіка прыбылі ў Мукдэн і адпраўляюцца ў Харбін для замены дывізіі Тамона, якая накіроўваецца ў Люяань (на поўдзень ад Мукдэну).

Агенцтва Сімбун Рэнга паведамляе з Харбіну, што брыгада Судзукі адправіцца з Цыцыкару на поўдзень і будзе заменена брыгадай Амано.

Партызанскі рух у Манчжурыі ўзмацняецца

ТОКІЁ, 14. Агенцтва Сімбун Рэнга паведамляе з Мукдэну, што ў мэтах узмацненьня барацьбы з партызанскім рухам, Манчжурскі ўрад ў бліжэйшыя дні правядзе перапіс насельніцтва. Будзе зьняты адбітак пальца кожнага жыхара. Насельніцтва будзе разьбіта на групы, якія будуць складацца з 6-10 сем'яў і **будуць несьці кругавую паруку за дзейнасьць кожнага члена групы.**

Танака аб савецка-японскіх адносінах

БЭЙПІН, 14. Паводле паведамленьня з Харбіну, прыбыўшы туды ўпаўнаважаны японскага міністэрства замежных спраў Танака (былы японскі пасол у Маскве) у інтэрв'ю з карэспандэнтамі харбінскіх газэт заявіў наступнае: «мэтай маёй паездкі ў Манчжурыю зьяўляецца аднаўленьне з новай дзяржавай і яе агульным становішчам. Манчжурыя знаходзіцца на верным шляху. Затрудненьні яшчэ будуць, але сур'ёзных затрудненьняў ня можа быць. Няма ніякіх прычын меркаваць, што япона-савецкія адносіны пагаршаюцца. Тым больш нельга надаваць значэньня чуткам аб ваенных сутычках паміж дзяржавамі. Рыбалоўнае пытаньне, якое зьвязана для мяне асабіста з многімі няпрыемнасьцямі, зараз амаль уладжана. Нявырашанымі засталіся толькі нязначныя пункты. Японскія лясныя канцэсіі на Савецкім Сахаліне ліквідаваны. Атрыманьне канцэсій на распрацоўку нафты сустракае розныя затрудненьні з боку савецкай улады».

Заўвага ТАСС:

Ніякіх японскіх лясных канцэсій на Сахаліне ня было і няма. Што датычыць японскай нафтавай канцэсіі, дык работа яе разьвіваецца ўвесь час нармальна, ня сустракаючы ніякіх затрудненьняў.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ ТАСС

Народнаму Камісарыяту Замежных спраў стала вядома, што кітайскі консул ў Благавешчанску скарыстоўвае прадастаўленае яму права шыфраванай тэлеграфнай перапіскі для перадачы ў розныя канцы Кітаю і іншых краіны ўсякага роду адозваў за подпісам генэрала Ма, які скрываецца ў Хэйлунцзянскай правінцыі. Лічачы, што падобныя факты зьяўляюцца злоўжываньнем з боку кітайскага консула ў Благавешчанску прадастаўленымі яму правамі і што гэта можа нанесьці страту палітыцы строгага няўмешваньня ў манчжурскія справы, якая праводзіцца савецкім урадам, нарком замежных спраў запрапанаваў манчжурскаму ўраду адклікаць цяперашняга кітайскага консула ў Благавешчанску і замяніць яго другой асобай. Адначасова дано распараджэньне аб часовым спыненьні перадачы тэлеграм, якія перадаюцца кітайскім консулам у Благавешчанску.

НАЛЁТ НА ПРАЎЛЕНЬНЕ КУЧ У ХАРБІНЕ

Правакацыі белагвардзейцаў ня спыняюцца

БЭЙПІН, 16. З Харбіну паведамляюць, што правакацыі на КУЧ працягваюцца. У той час, як кітайская паліцыя ўсё яшчэ арыштоўвае савецкіх грамадзян, **белагвардзейцы,** якія арганізавалі выбухі на КУЧ, **працягваюць беспакарана сваю правакацыйную работу.** 15 красавіка была наладжана дэманстрацыя. **Частка белагвардзейцаў асадзіла праўленьне КУЧ, заняўшы выхад і выкрыкваючы пагрозы супроць савецкай часткі праўленьня КУЧ.** Белагвардзейцы крычалі: «дыпамітчыкі», «падрыўнікі». Дэманстрацыя праходзіла пад выглядам патрабаваньняў эвакуацыі з КУЧ і поўнага разьбіку. **Белагвардзейцы сарвалі дзьверы і ўварваліся ў габінэт адсутнага прадстаўніка праўленьня Кузьняцова і перарылі паперы.**

Дэманстранты несьлі плякаты, накіраваныя супроць КУЧ. Як паведамляюць, **кіраўнікі дэманстрацыі былі ўзброены.** Кітайская паліцыя і ахова чыгункі ня ўжылі ніякіх мер да недапушчэньня гэтага налёту і нічога не зрабілі, каб арыштаваць белагвардзейскіх бандытаў. Нядоўга да гэтага, натоўп белагвардзейцаў, прыкмеціўшы на вуліцы Кузьняцова, пакінуўся на яго. Кузьняцову ўдалося ўнікнуць нападу і ўехаць на сваёй машыне. **Паліцыя ў гэтым выпадку абмежавалася роляю наглядальніка.**

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

— На куставыя нарады рэдактароў калгасных насьцентаэт (гл. «Зьвязду» за 18/IV) па пытаньні—«Арганізацыя работы калгасных насьцентаэт на час сяўбы» выкліканы дадатковыя дакладчыкі: т. т. **Сімковіч** (Мазыр і Слуцак), **Чарняноў** (Гомель), **Дзерах** (Воршна), **Бялько** (Магілеў і Полацак).

Адказны рэдактар **М. ГАРЫН.**

Тры фрагмэнты з панурай драмы

Жыцьцёвы ўзровень шырокіх народных мас Польшчы зьнізіўся да такой ступені, што нават польская буржуазная прэса прымушана прызнаць яго ДАЛЁКА НІЖЭЙШЫМ ЗА ЖЫЦЬЦЁВЫ ЎЗРОВЕНЬ ПЭРЫЯДУ СУСЬВЕТНАЙ ВАЙНЫ. Ужо сёньня голад — ня здань, а панурая штодзенная сапраўднасьць у Польшчы.

На глебе беспрацоўя і галечы—жудасныя самагубствы, трагэдыі, ад якіх пялзянее ў жылах кроў. Хроніка самагубстваў ня зыходзіць са старонак буржуазнай прэсы.

Вось «Роботнік» за 7 красавіка. Чытаем аб самагубстве БЕСПРАЦОЎНАГА ПАЎЛА ГАРДЗЯКА. Ён ішоў чыгуначным шляхам з Варшавы. Уздоўж чыгункі беглі правады з электрычным токам у 5 тыс. вольт. Ля аднаго слупа Гардзяк спыніўся і абкруціў сябе дротам. Да другога канца прывязаў камень і перакінуў яго праз кабэль. Магутны электрычны ток на месцы забіў Гардзяка. ПРЫЧЫНА САМАГУБСТВА — БЕЗНАДЗЕЙНАЕ МАТАР'ЯЛЬНАЕ СТАНОВІШЧА, ГОЛАД.

Нядаўна ў Львове перад судом прысяжных адбываўся цікавы працэс. Судзілі 28-гадовую РОЗУ РОСЬ, беспрацоўную. Яе абвінавачвалі ў тым, што ноччу 19 жніўня 1931 году яна ўтапіла ў калодзежы сваё 2-гадовае дзіця. Роза Рось са сьлязамі на вачох тлумачыла сваё бязвыходнае становішча, у якім яна апынулася... СУД ПРЫСЯЖНЫХ ПРЫГАВАРЫЎ ЯЕ ДА ПАКАРАНЬНЯ СЬМЕРЦЮ.

«Ілюстраваны Кур'ер Цодзенны» паведамляе, што ў Браслаўскім павеце (Заходняя Беларусь) ВЁСКА КРОСНА была арэнай жудаснага эдарэньня. Селянін Аляксееў, гаспадарка якога пасьля падатковай экзэкуцыі была цалкам зруйнавана, сякерай пасек сабе левую руку, паперарэзваў жылы, убіў сабе нож у грудзі і заліваючыся крывёю, памёр. Гэта выклікала ў вёсцы вялікае ўзбуджэньне.

Прыведзеныя тры факты — гэта толькі тры невялічкія фрагмэнты з тэй панурай драмы, якой зьяўляецца жыцьцё мільёнаў рабочых і сялян Польшчы.

Аднак, шлях беспардоннага адступленьня з арэны клясавай барацьбы, не зьяўляецца шляхам усіх працоўных. Гэта — шлях слабых, выбітых з каляіны жыцьця адзінак. У цэлым-жа мільённыя народныя масы пад гегемоніяй пралетарыяту, пад кіраўніцтвам КПП, вядуць бескампрамісную барацьбу з клясавым ворагам — буржуазіяй і яе фашысцкай дыктатурай.

Рад бурных выступленьняў беспрацоўных за апошнія дні, гераічная барацьба бастуючых рабочых гуты «Гартэнзія», Дамброўскага басэйну — шмат аб чым гаворыць.

Мы мелі такія факты, як напад некалькіх сотень беспрацоўных на цягнік з каменным вугалем. Цягнік ішоў у напрамку Чэнстахова. Паміж станцыямі Заверцем і Мышковым цягнік быў спынен. Беспрацоўныя канфіскавалі вугаль, пачаўшы яго разгружаць з вагонаў. Выкліканым тэрмінова моцным атрадам паліцыі ледзь удалося адбіць цягнік і разагнаць беспрацоўных.

У ЛЬВОВЕ пасьля бурнай дэманстрацыі беспрацоўныя разграмілі пякарню, забіраючы сілай хлеб. У горадзе ўзьнялася паніка. Паліцыя толькі пасьля доўгіх баёў з беспрацоўнымі разагнала апошніх. Шмат арыштаваных.

У ЛОДЗІ з дому пры вуліцы Заходняй № 62 паліцыя выкінула на брук беспрацоўнага 65-гадовага КАЗАКА З ЖОНКАЙ І ТРЫМА БЕСПРАЦОЎНЫМІ ДОЧКАМІ. Абураны натоўп, які сабраўся і актыўна выказваў сваё нездаваленьне, — быў разогнаны паліцыяй.

Але ўвечары гэтага-ж дня беспрацоўныя выламалі дзьверы закрытай кватэры і сілай усялілі свайго таварыша нядолі.

Падобныя факты — штодзённае зьявішча. Буржуазная прэса выказвае яўную трывогу, заклікаючы паліцыю да «рашучых мер».

В. Т.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Пуск першага агрэгату Днепрабуду

КІЧКАС, 16/IV. А 3 гадз. 15 мін. ад быўся пуск першага агрэгату Днепрабуду. Першыя воды Дняпра прайшлі праз турбіну. Механізмы працуюць спраўна. Доўгая ўпартая бальшавіцкая барацьба калектыву рабочых і ІТР скончылася новым посьпехам. Куставы сход рабочых і ІТР пастанавіў скласьці графік пускавога перыяду, забясьпечыўшы пуск першай чаргі гідрацэнтральню да 1-га мая.

Апарат для прапрацоўкі грозьненскай нафты

ГРОЗНЫ. Закамплектаваны ўдарнае буйаўніцтва самой магутнай у СССР атмасфэрна-вакуумнай установкі для перапрацоўкі грозьненскай парафіністалй нафты. У выніку перагонкі будзе атрымана бензін, газа і цыліндравы дасьцілят выключна добрай якасьці. Трубчатка дасьць сырод для атрыманьня высокаякаснага авіяцыйнага алею—цэрозіну, вазаліну і асфальту, выраб якога будзе наладжвацца ўпарыпьню. Пуск трубчаткі намечан на 25 красавіка.

685 аўтамашын

Маскоўскі аўтазавод імя тав. Сталіна пракраваў першых трох пасьцідзенак красавіка выканаў на 100 проц. З пачатку месяца завод даў крайне 685 аўтамашын.

С.-г. машыны

15 красавіка **завод Гомсельмаш** выпусьціў 32 сіласарэзкі «Папэк», або 106,7 проц., 16 сячкарань, або 100 проц., 20 бульбасартовак—143 проц. і 4 канюшласартоўкі, што складае 118 проц.

* * *

Завод «Чырвоны мэталіст» за 15-га красавіка выпусьціў 11 жмыхадрабілак або 68,75 проц., 23 корнярэзкі—115 проц., 20 бульбамыек—66,7 проц., 1 балотны плуг—50 проц. і 68 боран—131,4 проц. пляну.

Рамонт вагонаў

З 11 па 15 красавіка **вагонарамонтны завод «Полымя рэвалюцыі»** выпусьціў з капвэнцыйнага рамонту 17 таварных вагонаў. (Паводле плану ў месяц трэба выпускаць 200 вагонаў).

Голкавыя вырабы

Віцебская голкавая фабрыка за час з 11—15 красавіка выпусьціла прадукцыі на суму 27.385 руб., што складае 111,1 проц. пляну.

Агляд работы бюро скаргаў

Прадпрыемствы Магілева арганізуюць групы садзейнасьці РСІ

Пасты бюро скаргаў вярбуюць добраахвотнікаў

Рабочыя магілеўскіх фабрык і заводаў арганізуюць ударныя брыгады імя РСІ

У сувязі з правядзеньнем пяцідзеньніка агляду бюро скаргаў РСІ, у Магілеўскім раёне разгарнулася шырокая масавая работа. Рабочыя паасобных прадпрыемстваў, уключыўшыся ў пяцідзеньнік, узялі на сябе рад абавязацельстваў, як-та: выкананьне датэрміновага прамфінпляну другога кварталу, выкананьне фінпляну, мабілізацыя ўнутраных ресурсаў і інш. Арганізуюцца ўдарныя брыгады імя РСІ. Мабілізавана 120 чал., якія пасланы ў сельсаветы для практычнай дапамогі ў падрыхтоўцы і правядзеньні 3-й бальшавіцкай вясны.

У кожным сельсавеце будуць праверены сэкцыі РСІ, а таксама будуць арганізаваны групы садзейнасьці РСІ ў больш буйных калгасах.

Для правядзеньня пяцідзеньніка і дакладаў аб значэньні бюро скаргаў РСІ па прыгарадных гаспадарках, саўгасах і больш дробных прадпрыемствах пасланы 14 чал.

Ужо праведзена праверка работы сэкцыі РСІ пры гарсавеце. Адбыўся гарадзкі зьлёт лёгкай кавалерыі, на якім прысутнічала 200 чал. Зьлёт цалкам уключыўся ў правядзеньне пяцідзеньніка агляду бюро скаргаў. Арганізавана ўзаемная праверка работы 16 штабаў лёгкай кавалерыі вядучых прадпрыемстваў. Разгарнулася масавая праверка шэфства над дзяржапаратам і работы сацсэкцыячыльнікаў, а таксама правяраецца шэфства гораду над вёскай пад кутом погляду, як рабочыя дапамагаюць калгасам і адпаасобнаму сэктару ў падрыхтоўцы да 3-й бальшавіцкай вясны.

7 па-заштатных інспэктароў і 7 прадстаўнікоў сэкцыі РСІ гарсавету зараз правяраюць прахаджэньне скаргаў і заяў у апаратах РВК, інспэкцыі працы, гаражыласаюзе і райкалгасаюзе. Арганізавана брыгада лёгкіх кавалерыстаў і рабочых засядацеляў бюро скаргаў па праверцы залежаў грузаў на чыгунцы. Правяраецца работа 12 кантрольных пастоў РСІ пры установах і некаторых прадпрыемствах.

Праведзены ўжо справаздачы бюро скаргаў на заводах «Чырвоны адраджэнец», «Пралетары», «Зара» і шаўковай фабрыцы. На ўсіх гэтых прадпрыемствах арганізуюцца новыя групы садзейнасьці РСІ, пасты бюро скаргаў і вярбуюцца добраахвотнікі.

Райштаб па праверцы бюро скаргаў.

Абавязкі рабочых, ІТР і служачых шаўковай фабрыкі

Уключыўшыся ў пяцідзеньнік праверкі работы бюро скаргаў РСІ, рабочыя, ІТР і служачыя магілеўскай шаўковай фабрыкі бяруць на сябе наступныя абавязкі:

Забясьпечыць 100 проц. выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну другога кварталу чацьвертага, заключнага году пяцігодкі па ўсіх паказальніках.

Давесьці да 100 проц. ахопу ў другім квартале падпіскай усіх рабочых фабрыкі на сацуклад, а таксама падтрымаць пастанову калектыву ЛКСМБ фабрыкі аб штомесячным адлічэньні аднаго рубля на сацуклад да канца пяцігодкі.

Забясьпечыць датэрміновае (ад 1 да 3 месяцаў) 100 проц. унясеньне дыфэрэнцыяванага паю рабочымі, ІТР і служачымі фабрыкі, згодна прынятых пастаноў рабочымі на агульных сходах.

У галіне правядзеньня трэцяй бальшавіцкай вясны забясьпечыць выкананьне абвешчанага конкурсу прыгараднай гаспадаркай шаўковай фабрыкі і паслаць брыгаду ў В.-Белявіцкі сельсавет для практычнай дапамогі.

Завербаваць добраахвотны актыў для работы ў бюро скаргаў РСІ.

Арганізаваць на фабрыцы дзьве ўдарныя брыгады імя РСІ.

Праверыць шэфства над банкаўскімі ўстановамі.

Правесьці нараду з падшэфнымі фабрыцы фінансава-банкаўскімі работнікамі, сумесна з сацнакесьнікамі і грамадзкімі арганізацыямі фабрыкі па пытаньні становішча і паляпшэньня пралетарскага шэфства над савецкім апаратам.

Па даручэньні рабочых, ІТР і служачых фабрыкі:

трыкутнік — КРЫВУЛІН, СТАЛЯРОЎ, НЯФЕДАЎ.

ПЛЯНЫ СТЫМСОНА

ЖЭНЭВА, 15-IV. Жэнэва чакае прыезду Стымсона. Ён павінен даць штурмшок і выцягнуць з ткані каляску эўрапэйскіх спраў. Усё, што адбывалася за апошнія тыдні, азначала барацьбу за зыходныя пазыцыі для надыходзячага спаборніцтва. Пакуль што ў Жэнэве займаюцца толькі эўрапэйскімі справамі. Далёка-ўсходнія адсунуты ў сьвядомасьці эўрапэйскіх палітыкаў на задні плян. Англійская і французская дыпляматыя зацікаўлены ў тым, каб грамадзкая думка ня прыкмеціла сабатажу пастаноў Лігі нацый, якія закранаюць эвакуацыю японскіх войск з Шынхаю. Аб Манчжурыі наогул стараюцца не гаварыць. Асабліва падкрэсьліваецца, што Стымсон не прывязе з сабой экспэртаў па далёка-ўсходніх справах. Амэрыканскія колы ўказваюць у адказ, што экспэрты тут ня прычым, бо справа заключаецца ў ажыцьцяўленьні ўжо прынятых пастаноў. Амэрыканцы ня ўтойваюць, што Злучаныя Штаты будуць энэргічна націскаць на англійскую дыпляматыю і паспрабуюць прымусіць яе заняць ясную пазыцыю, а не прыкрываць пустымі гутаркамі, падтрыманьне, якое аказваецца Японіі.

Набліжаецца момант, калі камісія Літона павінна прадставіць даклад аб становішчы Манчжурыі. Стымсон, які ўжо зьняў дачу на месяц, зьбіраецца прысутнічаць пры гэтым. Пакуль што ўся ўвага сканцэнтравана на падрыхтоўцы да новых выбараў ва Францыі і ў ПАЗШ, а таксама на пагрозе фінансавай катастрофы, якая навісла над банкамі і прыдунайскімі краінамі. Абодвы гэтыя моманты націскаюць на канферэнцыю па разбраеньні. Ня ўлічваючы гэтага, нельга больш разумець таго танцу цэняў, які адбываецца на гэтай няшчаснай канферэнцыі.

Зыходным пунктам другога акту канферэнцыі па разбраеньні зьяўляецца канферэнцыя чатырох дзяржаў. Аўстрыя, Венгрыя, Югаславія, Румынія, Баўгарыя і Грэцыя збанкрутавалі. Яны ня могуць плаціць процанты па замежных пазыках і пэнсію чыноўнікам. Францыя ўкпала ў гэтыя краіны за пасляваенныя гады 7 млрд. папяровых франкаў у форме дзяржаўных пазык і мілярды ў прыватныя пазыкі. Крах гэтых краін ударыць па фінансах ня толькі Францыі, але Англіі і ПАЗШ. Знаменічна ён ударыць у першую чаргу па Германіі, якая займае першае месца ва ўмовах вялізарнай напружанасьці эканамічнага становішча Германіі, справа можа скінуцца новай хваляй банкаўскіх крахаў.

Па Францыі крызіс разгортваецца і паглыбляецца. У Англіі, ня гледзячы на казённы оптымізм, не наступіла ніякага паляпшэньня ў асноўных паказальніках прадукцыі. У ПАЗШ мерапрыемствы ўраду не ствараюць ніякага пералому да лепшага. Пры гэтых умовах адкрыў прызнаньне банкрутства прыдунайскіх і балканскіх краін можа зрушыць з месца ўсю павіну.

Пляну «аздараўленьня» паўднёвага ўсходу Эўропы ня мае і ўжо ня можа мець ні адна з імпэрыялістычных групован. Як паказвае справаздача фінансавай камісіі Лігі нацый, справа можа заключацца толькі ў перадышцы шляхам скарачэньня бюракратычнага і банкаўскага апаратаў гэтых краін. Для гэтай мэты Францыя прапанавала англа-французкую пазыку ў 200 млн. зал. руб. для Аўстрыі, Венгрыі, Румыніі і Югаславіі. Узамен гэтыя дзяржавы павінны заключыць паміж сабой згоду на аснове пераважных тарыфаў; у гэтай згодзе павінна прымаць удзел таксама Чэха-Славакія. Кіруючы ўплыў на гэтай тэрыторыі, павялічанай у сваіх размерах ранейшай аўстра-венгерскай манархіяй, напежаў-бы Францыі, як саюзьніцы Югаславіі, Румыніі і Чэха-Славакіі. Магчыма, што Англія і ПАЗШ і пайшлі-бы на такое ўзмацненьне ўплыву французкага імпэрыялізму для выратаваньня ўкладзеных у Паўднёва-Ўсходнюю Эўропу капіталаў. Але нават часовы посьпех французкага пляну запежыць цалкам ад Італіі і Германіі, якія зьяўляюцца галоўнымі пакупнікамі сельска-гаспадарчых прадуктаў Паўднёва-Ўсходняй Эўропы і карыстаюцца, паводле дагавораў з гэтымі краінамі, перавагамі найбольш спрыяючай нацыі. Ні Італія, ні Германія не пажадалі адмовіцца ад сваіх правоў і ня згодны дапамагчы перамозе французкага імпэрыялізму без звароту. Германія ўзяла рэванш за сабатаж аўстра-германскай мытнай уніі з боку Францыі.

Няўдача канферэнцыі чатырох дзяржаў, аднак, не азначае канчатковага правалу французкага пляну. Французкая і германская дыпляматыя вядуць перагаворы аб кампэнсацыі Германіі ў галіне рэпарацыйнага пытаньня, якое зноў павінна быць «вырашана» ў чэрвені на Лёзанскай канферэнцыі. Але Францыя ў гэтым пытаньні ня хоча і ня можа ісьці далёка. Французкі бюджэт дасьць у гэтым годзе 3 млрд. франкаў дэфіцыту, а ў будучым магчыма, усе 6 млрд. Уступкі Францыі залежаць ад таго, ці згадзяцца Злучаныя Штаты на перагляд дагавораў аб ваенных даўгох, пасьля таго, як амэрыканскі сэнат забараніў усякія скідкі па даўгавых абавязацельствах былых саюзьнікаў.

Амэрыканская дыпляматыя хоча зрушыць справу з мёртвага пункту. Стымсон прыяжджае іменна з гэтай мэтай. Ён хоча, па-першае, дабіцца памяншэньня эўрапэйскіх сухаземных узбраеньняў, што пазьсіла-б удзельную вагу Амэрыкі, а па-другое, ён хоча дабіцца перамены далёка-ўсходняй палітыкі Францыі і Англіі ўзамен за перагляд ваенных даўгоў. Посьпех стымсонаўскіх плянаў у Жэнэве ўзмацніў-бы пазыцыю Гувэра на надыходзячых прэзыдэнцкіх выбарах і даў-бы яму магчымасьць зьмяніць пастанову сэната аб міжнародных даўгох.

Выступленьне Гібсона з прапановамі, накіраванымі ў першую чаргу супроць сухаземных, г. зн. супроць французкіх узбраеньняў азначае, што бойка з-за пляну Стымсона пачалася. Адказ Тард'е, а ў яшчэ большай меры адкрытыя выступленьні французкага імпэрыялістычнага друку паказваюць, што перамога дасьцца Стымсону ня лёгка. Яна больш чым сумніцельная.

Францыя ня хоча пакупаць кота ў мяшку. Яна ня мае памеру адмаўляцца ад сваіх пазыцый дзеля абяцаньняў скараціць ваенныя даўгі, а Стымсон можа прапанаваць ёй толькі абяцаньні, ды і то закулісныя.

Англіі нічога не каштуе падтрымаць ПАЗШ у пытаньні аб сухаземных узбраеньнях. Ад іх памяншэньня яна таксама выйграла-б. Але інакш стаіць справа з пытаньнем аб падтрыманьні Англіяй Японіі.

Ангельская дыпляматыя таксама ня ўступіць гэты козыр, калі нават дапусьціць, што яна наогул гатова зрабіць яго прадметам гандлю.

Жэнэва чакае прыезду Стымсона з цікавасьцю, але без таго хвалявання, якое яшчэ некалькі год назад выклікала зьяўленьне носьбітаў «просперыці».

Крызіс разьвянчаў ПАЗШ. Пакуль яшчэ Амэрыка багацейшая і мацнейшая за другія капіталістычныя краіны, але і яна падпала ўсім недамаганьням капіталізму. Крызіс дзёргае Амэрыку ня менш, чым эўрапэйскія краіны; беспрацоўных амэрыканская буржуазія баіцца таксама, як і эўрапэйская; японскія салдаты б'юць амэрыканскіх консулаў, як і эўрапэйскіх дыпляматаў. ПАЗШ дыктаваць ужо ня могуць. Амэрыканскай дыпляматыі прыдзецца зьясьці з Алімпа і змагацца за свае пазыцыі.

Яшчэ ў мінулым годзе Гувэр папрабаваў прадыктаваць рэпарацыйны мараторый, як Мэйсей дыктаваў свае запаведзі з гары Сінай. Але яму прышлося ўступіць у перагаворы, што зусім не падыходзіць прарокам.

У гэтым годзе ў страху перад новымі катастрофамі п. Стымсон адправіўся асабіста на жэнэўскую біржу. Хто-ж можа яшчэ сумневацца, што «дэмакратыя» ідзе наперад? («Известия»).

ПРАФІНТЭРНАЎЦЫ НАПЕРАДЗЕ

ВІЦЕБСК. (БЕЛТА). Пяцідзеньнік бюро скаргаў па Віцебску праходзіць нездавальняюча. Гэтаму важнейшаму мерапрыемству большасьць фабрычна-заводзкіх арганізацый не надалі палітычна-масавага характару.

Па-баявому ўключыліся ў пяцідзеньнік толькі рабочыя фабрыкі «Прафінтэрн». Па ўсіх цэхах праведзены сходы рабочых аб задачах пяцідзеньніка. Уцягнута ў дапамогу РСІ 25 добраахвотнікаў з лепшых ударнікаў. За час падрыхтоўкі ўзрасла палітычная і вытворчая актыўнасьць рабочых. **8-га, 9-га і 10-га красавіка фабрыка перавыканала прамфінплян.** Гаспадарча - разрахункова брыгада Шумлцера і Райшштэйна, штодзенна высоўваючы зьменна-сустрэчны плян, дабілася ў апошні час выкананьня пляну на 106-108 проц.

Пасьпяхова выканаўшы фінплян першага кварталу, рабочыя абавязаліся ў другім квартале ўзмацніць гэту работу і высунулі сустрэчную лічбу ў 25 проц. звыш пляну.

Рабочыя абавязаліся перавыканаць прамфінплян за красавік, сабраць па менш 50 прапаноў, уцягнуць у работу РСІ 70 лепшых ударнікаў, з іх ня менш 60 проц. жанчын.

Пачалі разгортваць работу па пяцідзеньніку фабрыка «Сьцяг індустрыялізацыі», фанэрны завод, панчошная фабрыка, але іх работа ня носіць ударнага характару.

У калгасах Віцебскага раёну работа па пяцідзеньніку зусім не разгорнута. Прафінтэрнаўцы павінны дапамагчы адстаючым, перанёсшы вопыт сваёй работы на іншыя прадпрыемствы і калгасы.

Канфэрэнцыя па якасьці прадукцыі прамысловасьці Наркамснабу БССР адкрываецца заўтра, 20 красавіка, ў 6 гадзін вечара, у клюбе харчавікоў (Інтэрнацыянальная, рог Камсамольскай).

Рэгістрацыя дэлегатаў з 9 гадз. раніцы да 4-х гадз. дня, у памяшканьні Наркамснабу (3-ці паверх, пакой № 6), а з 5 да 6 гадзін — у памяшканьні клюбу.

Месцы для прыежджых дэлегатаў адведзены ў 1-й савецкай гасьцініцы (Камсамольская вуліца).

Па ўсякіх справах зварачацца па тэлефону 8-78 да т.т. Касьцевіча, або Левіна.

Штаб па правядзеньні канфэрэнцыі.

ГАБІНЭТ ДРУКУ КУБ арганізуе **даклад брыгады „Зьвязды“,** яная правяла работу ў Ботвінскім сельсавеце, Крычаўскага раёну.

Дакладчык т. **Джэлюк.**

Даклад адбудзецца 19 красавіка ў 7 з палов. гадзін вечара (Камвуз, 4 паверх, актавая заля).

Запрашаюцца работнікі рэдакцый цэнтральных газэт і фабрычна-заводзкіх шматтыражак.

Габінэт друку.

21 красавіка, у 7 гадз. веч., у клюбе Нарсувязі (Ленінская, 34)

ДЗЯРЖАРБІТРАЖАМ з удзелам грамадзкасьці

БУДУЦЬ РАЗГЛЕДЖАНЫ СПРЭЧКІ

паміж выдавецтвам „ЗЬВЯЗДА“ і Саюздрукам Бел. кіраўніцтва сувязі

аб недахопах па дастаўцы газэт і часопісяй.

Запрашаюцца рэдакцыйна-выдавецкія работнікі, рабкоры і чытачы газэт.

Уваход вольны

Дзярж. арбітр. пры СНК БССР.

У серэду, 20 красавіка, роўна ў 7 гадз. веч., у актавай залі Бел. Дзярж. Унівэрсытэту (галоўны корпус, Унівэрсытэцкі Гарадок) адбудзецца

урачыстае пасяджэньне, прысьвечанае 50-годзьдзю са дня сьмерці Ч. Дарвіна.

ПАРАДАК ДНЯ:
1) Уступнае слова праф. **Федзюшына.**
2) Дарвін, як эвалюцыяніст—дакл. дац. **Гусева.**
3) Натуральны адбор і эвалюцыя—дакл. дац. **Зубковіч.**
4) Марксызм-ленінізм і дарвінізм—дакл. дац. **Дзербянцоў.**

Запрашаюцца ўсе навуковыя працаўнікі ВНУ і НДІ, настаўніцтва БДУ, студынцтва ВПІ мэд. ін-т.

Арг. камісія БДУ.

Вечар, прысьвечаны 50-годзьдзю са дня сьмерці Ч. Дарвіна.

19 красавіка, у 7 гадз. веч., у Доме Камасьветы адбудзецца

пасяджэньне акадэмічнага савету Беларускай акадэміі навук

разам з ТВМД і бюро СНП

з удзелам прадстаўнікоў ВНУ, рабочых, грамадзкіх і культурных арганізацый, прысьвечанае 50-годзьдзю са дня сьмерці Ч. Дарвіна.

ПАРАДАК ВЕЧАРУ:
1) Уступная прамова прэзыдэнта Беларускай акадэміі навук т. **ГОРЫНА.**
2) Вучэньне Ч. Дарвіна і задачы тварытычнай прапрацоўкі праблем сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР (т. **ГАНЧАРЫК**).
3) Дарвін, як мысьліцель (т. **ВАЛАБРЫНСКІ**).

Білеты прадпрыемствы і ўстановы могуць атрымаць у масавым сэктары БАН да 3 з пал. гадзін дня.

Беларуская акадэмія навук.

кіно ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА

2 СЭРЫІ Ў АДЗІН СЭАНС

АД 19-IV

АМЭРЫКАНСКІ ФІЛЬМ ВЫТВ. 1928 г.

МАУЧАЦЬ!

(Бязбожніца)

у 2-х сэрыях, 10 частках.

РЭЖЫСЭР Сесіль дэ-Міль

У ГАЛ. РОЛЯХ: Ліна Гаскет, Мары Прэсо, Джордж Дэрыс, Эдзі Чвілан, Нов Бірыс.

„Мы паказваем не тэорыі, а факты. Звыш двух год мы зьбіралі матар'ялы ў школах прынуд. выхаваньня ў ПАЗШ. Кожны эпізод пацьвярджаецца сьведкамі і